КУЛЬТУРА

WWW.KIMPRESS.BY
ВЫДАЕЦЦА З КАСТРЫЧНІКА
1991 г. / № 33 (1368)
18 жніўня 2018 г.

“Час цішыні. Возера Удомля”. 1911 год.

Музыка пейзажу ў новым святле

1 верасня пасля пяцігадовай рэканструкцыі зноў адкрыецца для наведвальнікаў Музей Вітольда Бялыніцкага-Бірулі ў Магілёве. Экспанаты ўжо перавезлі са сховішча Нацыянальнага мастацкага музея ў абноўленыя залы яго рэгіянальнага філіяла. “К” назірала за тым, як пакавалі работы знанага майстра пейзажу.

Вераніка МОЛАКАВА / Фота Ганны ШАРКО і з архіва НХМ РБ

Партрэт Вітольда Бялыніцкага-Бірулі аўтарства Аляксандра Маравава.

“УСЁ ПАТРАБАВАЛА АБНАЎЛЕННЯ”

Калі ў красавіку 2013 года музей у Магілёве часова закрылі, рэчы і творы, якія там выстаўляліся, перавезлі ў сталіцу, дзе збіраецца і захоўваецца ўся калекцыя прадметаў, датычных асобы Бялыніцкага-Бірулі. Яе спіс у фондах Нацыянальнага мастацкага музея займае больш за 600 пазіцый: каля 450 жывапісных работ, а таксама каля 200 дакументаў, фотаздымкаў, мэблі і посуду з пабудаванага мастаком лецішча “Чайка” ў Цвярской вобласці. Усё гэта музейшчыкам давялося яшчэ раз перагледзець, каб паклапаціцца пра змены ў самой экспазіцыі, пакуль будаўнікі працавалі над рэстаўрацыяй фасада і заменай даху.

Заканчэнне — **на старонках 2 — 3.**

Соцыум

ТОЛЬКІ АДРЭСТАЎРАВАЦЬ — ЗАМАЛА

Слонімская сінагога прызнаная адным з самых каштоўных аб’ектаў яўрэйскай спадчыны Еўропы. Але стан яе сёння бадай крытычны. Як захаваць бажніцу і даць ёй другое жыццё?

ст. 4 — 5

Prof-партфоліо

ФЛЭШМОБЫ НА АСФАЛЬЦЕ

Не так даўно Гарадскога палацу культуры ў сталіцы не было. Сёлета ён адкрыўся — наўзбоч ад цэнтра. Якой павінна быць установа падобнага профілю ў насычаным рознымі прапановамі мегаполісе?

ст. 10 — 11

а"К"но ў свет

ЗААПАРК ДЛЯ ЧАЛАВЕКА

Рыжская біенале ўражвае найперш сваімі маштабамі. Сучаснае мастацтва надзвычай удала ўпісанае куратарам у гарадское асяроддзе. Толькі ці можна казаць у дадзеным выпадку пра свежасць мыслення і навізну выяўленчай мовы?

ст. 12

ПРАЦЯГВАЕЦЦА ПАДПІСКА НА ГАЗЕТУ "КУЛЬТУРА" ПРАЗ ІНДЫВІДУАЛЬНЫ (63875) І ВЕДАМАСНЫ (638752) ІНДЭКСЫ.

З дапамогай банкаўскай карткі газету можна выпісаць праз інтэрнэт-сэрвіс на сайце "Белпошты" (пункт "Афармленне падпіскі на друкаваныя сродкі масавай інфармацыі").

9 771994 478007 18033

Конкурс на лепшы знак

Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь абвясціла аб правядзенні творчага конкурсу эскізных праектаў нагрудных знакаў да ганаровых званняў. Заяўкі і дэманстрацыйныя матэрыялы прымаюцца Нацыянальным цэнтрам сучасных мастацтваў да 14 верасня 2018 года ўключна.

Настасся ПАНКРАТАВА

Мэтай творчага конкурсу з'яўляецца пошук найбольш выразнага мастацкага вобразу нагрудных знакаў да ганаровых званняў "Народны", "Заслужаны", "Заслужаны майстар спорту Рэспублікі Беларусь", "Заслужаны трэнер Рэспублікі Беларусь". Па кожнай з гэтых чатырох намінацый журы вызначыць трох пераможцаў. За першае месца можна атрымаць 36 базавых велічынь, за другое — 33 базавыя велічыні, за трэцяе — 30 базавых велічынь.

Абавязковая ўмова для ўдзельнікаў — наяўнасць прафесійнай адукацыі ў сферы выяўленчага мастацтва, дызайну, скульптуры ці адпаведны вопыт па распрацоўцы эскізных праектаў дзяржаўных узнагарод Рэспублікі Беларусь. Таксама прымуць заяўкі і ад студэнтаў творчых ВНУ.

Пажадана, каб кампазіцыйнае і пластычнае выкананне нагрудных знакаў адпавядала сфарміраваным ў Рэспубліцы Беларусь падыходам да мастацкага рашэння дзяржаўных узнагарод. Усе конкурсныя праекты павінны прадугледжваць, што нагрудны знак мусіць вырабляны з металу і будзе прымацоўвацца да адзення з дапамогай шпількі.

Больш падрабязна пра ўмовы конкурсу і правілы афармлення заяўкі можна прачытаць у інструкцыі, якая выкладзена на сайце Міністэрства культуры ва ўкладцы "Конкурсы і мерапрыемствы".

К

Цікавы час у Венецыі

Да 22 кастрычніка 2018 года прымаюцца заяўкі на конкурс на стварэнне куратарскай канцэпцыі беларускага павільёна на 58-й Венецыянскай біенале сучаснага мастацтва. Арганізатары конкурсу — Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь і Нацыянальны цэнтр сучасных мастацтваў.

Дар'я АМЯЛЬКОВІЧ

Удзельнікамі конкурсу могуць быць мастацтвазнаўцы, мастакі і іншыя фізічныя асобы, якія маюць вопыт арганізацыі і правядзення буйных культурных праектаў у галіне выставачнай дзейнасці. Заяўка ці канцэпцыя праекта, якую чакаюць у Нацыянальным цэнтры сучасных мастацтваў, павінна адпавядаць тэме і дэвізу 58-й Венецыянскай біенале — "Каб ты жыў у цікавы час" ("May you live in interesting time") і ўтрымліваць новыя арыгінальныя ідэі ў рэчышчы сучаснага мастацтва. Асобнае патрабаванне конкурсу тычыцца выкарыстання сучасных мультымедыя-тэхналогій. Да канцэпцыі аўтары заяўкі павінны далучыць каштарыс рэалізацыі свайго праекта.

Ацэнка заявак будзе ўскладзена журы, склад якога зацвярджаецца Міністэрствам культуры краіны. Рашэнне аб лепшым праекце прымаецца на закрытым пасяджэнні журы адкрытым галасаваннем прысутных.

Каб вынесці па магчымасці аб'ектыўнае рашэнне, конкурс прадугледжвае захаванне ананімнасці яго ўдзельнікаў. Так, аўтарская Канцэпцыя мусіць быць прадстаўлена ў канверце, на якім указваецца толькі чатырохзначны нумар. А персанальныя звесткі аўтара ці аўтараў заяўкі падаюцца ўжо ў другім канверце — так званым, канверце ўдзельніка.

Вынікі конкурсу будуць аб'яўлены не пазней за 30 кастрычніка.

К

Квіток як сувенір

Яшчэ адзін конкурс для дызайнераў аб'явіў Мірскі замак. Да 30 верасня ўсе ахвотныя могуць прапанаваць свой варыянт уваходнага квітка ў адзін з самых папулярных беларускіх музеяў. Галоўным крытэрыем ацэнкі з'яўляецца арыгінальнасць дызайну, здатная матываваць наведвальніка не выкідаць той квіток у сметніцу, а захоўваць яго ў якасці сувеніра.

Што цікава, на час правядзення конкурсу яго ўдзельнікам дазволена бясплатна фатаграфаваць інтэр'еры замка і размешчаныя ў экспазіцыі прадметы. Падрабязней умовы конкурсу – на сайце ўстановы.

Газета КУЛЬТУРА
ШТОТЫДНЁВАЯ ГРАМАДСКА-ПАЛІТЫЧНАЯ, ДЛЯ ДАСУГУ (КУЛЬТУРА, МАСТАЦТВА) Выдаецца з кастрычніка 1991 года.
Заснавальнік — Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь.
Рэгістрацыйнае пасведчанне № 637, выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.
Галоўны рэдактар — Ілья Васільевіч СВІРЫН; **намеснік галоўнага рэдактара** — Вераніка МОЛАКАВА; **адказны сакратар** — Юрый КАРПЕНКА; **рэдактары аддзелаў:** Надзея БУНЦЭВІЧ, Яўген РАГІН; **аглядальнікі рэдакцыі:** Дар'я АМЯЛЬКОВІЧ, Іна НАРКЕВІЧ, Настасся ПАНКРАТАВА, Генадзь СІВОХІН, Юрый ЧАРНЯКЕВІЧ; **спецыяльныя карэспандэнты:** Пётр ВАСІЛЕЎСКІ, Алег КЛІМАЎ; **карэспандэнт** — Ганна ШАРКО; **фотакарэспандэнт** — Сяргей ЖДАНОВІЧ; **мастацкі рэдактар** — Наталля ОВАД; **карэктар** — Таццяна ПАШЭНЬКА.
Сайт: **www.kimpress.by.** E-mail: **kultura@tut.by.** Адрас рэдакцыі: 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 77, чацвёрты паверх. Тэлефоны: (017) 286 07 97, (017) 334 57 23. Тэлефон-факс: (017) 334 57 41. Рэкламны аддзел: тэл. (017) 286 07 97, 334 57 41.
Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова "КУЛЬТУРА І МАСТАЦТВА".
Дырэктар — СЛАБОДЗІЧ Ірына Аляксееўна;
першы намеснік дырэктара — КРУШЫНСКАЯ Людміла Аляксееўна.
Прыёмная: (017) 334 57 41.
220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 77. Чацвёрты паверх. Бухгалтэрыя: (017) 334 57 35.
Аўтары допісаў паведамляюць прозвішча, поўнасцю імя і імя па бацьку, пашпартныя звесткі (нумар пашпарта, дату выдачы, кім і калі выдадзены пашпарт, асабісты нумар), асноўнае месца працы, зваротны адрас. Аўтарскія рукапісы не рэцэнзуюцца і не вяртаюцца. Меркаванні аўтара могуць не адпавядаць пункту гледжання рэдакцыі. Аўтары нясуць адказнасць за дакладнасць матэрыялаў.
*Матэрыял на правах рэкламы.
©"Культура", 2018. Наклад 3 566. Індэксы 63875, 638752. Рознічны кошт — па дамоўленасці. Падпісана ў друк 17.08.2018 у 20.00. Замова 2741.
Рэспубліканскае ўнітарнае прадпрыемства "Выдавецтва "Беларускі Дом друку".
ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004. Пр. Незалежнасці, 79, 220013, Мінск.

Па пытаннях размяшчэння рэкламы ў газеце "Культура" звяртайцеся па тэлефоне + 375 17 286 07 97 і па тэлефоне/факсе +375 17 334 57 41, альбо пішыце на электронны адрас kultura@tut.by

Музыка пейзажу

(Заканчэнне. Пачатак на старонцы 1.)

— Філіял у Магілёве працуе з 1982 года, таму абнаўлення патрабаваў не толькі будынак, але і яго музейная "начынка", — распавядае навуковы супрацоўнік аддзела рускага і замежнага мастацтва НММ РБ Дар'я Барташук. — Куратар новай экспазіцыі — намеснік генеральнага дырэктара музея па навуковай рабоце Аляксей Харак. Яго канцэпцыя скіравана найперш на тое, каб паказаць мастака і яго сувязь з Беларуссю. Таму мы звяртаем асаблівую ўвагу наведвальніка на апошні візіт Бялыніцкага-Бірулі на радзіму, калі ў 1947 годзе ён, ужо немалады і хворы, жыў нейкі час на Белай Дачы, у цяперашняй мінскай Курасоўшчыне. Некаторыя эцюды таго часу перавязём у Магілёў. Увогуле, экспазіцыя істотна змянілася. Мы пакінулі знакавыя рэчы, але адлюстравалі і тыя тэмы, якія раней шырока не асвятляліся. Напрыклад, асобны раздзел прысвечаны Поўначы, бо вядома, што Бялыніцкі-Біруля вельмі любіў падарожнічаць.

Задача новай экспазіцыі яшчэ і ў тым, каб паказаць мастака як майстра пейзажу, адлюстроўваючы розныя перыяды яго творчасці. Таму ў адной з залаў абавязкова будзе знакаміты "Зімні сон", уганараваны бронзавым медалём на Міжнароднай выставе ў Барселоне. Бялыніцкі-Біруля стаў вынаходнікам жанру мемарыяльнага пейзажу, і такія працы таксама знойдуць месца ў музейнай прасторы. А таксама ўсё тое, што тычыцца яго знакамітага лецішча "Чайка".

Сяброўскія сустрэчы

Тэатр Генадзя Гладкова "Тэрыторыя мюзікла" прыняў удзел у буйным Міжнародным фестывалі Juras Perle у Юрмале і прывёз адтуль не толькі балтыйскі загар і прыемныя ўражанні, але і перспектыўныя прафесійныя кантакты.

Фестываль музыкі, тэатра і кіно Juras Perle прайшоў у Юрмале ўсяго ў другі раз, але — дзякуючы найперш асабістым сувязям прядзюсараў — сабраў настолькі зорны склад артыстаў, што далучыцца да гэтай кампаніі можна толькі палічыць за гонар. Старэйшае, ужо легендарнае пакаленне творцаў было прадстаўлена Ірынай Мураўёвай, Аляксандрам Зацэпіным, Верай Алентавай, Уладзімірам Мяншовым, Міхаілам Баярскім, Юозасам Будрайцісам, Святланай Немаляевай, Валянцінай Талызінай.

"Тэрыторыя мюзікла" трапіла на Juras Perle дзякуючы сяброўству з Даўгаўпілскім тэатрам, які на пряцягу апошніх гадоў запрашае калектыў на гастролі. І, безумоўна, аўтарытэту ідэйнага натхняльніка беларускага тэатра — народнага артыста Расіі Генадзя Гладкова. Абысці ўвагай творчасць маэстра, які напісаў, здаецца, добрую палову галоўных кінашлягераў эпохі, арганізатары не маглі і не хацелі. Таму частка фестывальнай праграмы была якраз і прысвечана музыцы Гладкова.

На пряцягу пяці фестывальных дзён Мікіта Высоцкі, Дзмітрый Харацьян, Дзмітрый Дзюжаў, Гоша Куцэнка, Аляксей Кортнеў ды многія іншыя ўзгадвалі тыя песні, якім падпявалі ўсе гледачы. На вузкіх вулачках курортнай Юрмалы панавала цёплая душэўная атмасфера, а ў службовай частцы канцэртнай залы "Дзінтары" здараліся прыемныя сяброўскія сустрэчы і знаёмствы. Ідэя фэсту — цудоўная! І яе ўвасабленне таксама.

Зразумела, каму, як не артыстам аўтарскага тэатра Гладкова выконваць знакамітыя песні з ягоных "Брэменскіх музыкантаў", "Звы-



ў новым святле

“КАЛЕКЦЫЯ — АМАЛЬ ЭТАЛОННАЯ”

Для адпраўкі ў Магілёў падрыхтавалі 46 жывапісных работ, хаця дызайн-праект абноўленых залаў прадугледжвае іх крыху менш. Запас разлічаны на тое, што ў працэсе размяшчэння экспазіцыі можа ўзнікнуць патрэба ў чымсьці крыху адысці ад першапачатковай задумы. Каб упакаваць экспанаты, патрэбны ўсяго адзін дзень. Але яму папярэднічала шматмесячная праца. З 46 адабраных 21 карціна мусіла прайсці кансервацыю.

— Не трэба толькі блытаць яе з рэстаўрацыяй — гэта маштабнае аднаўленне , а кансервацыя — штосьці накшталт касметычнага рамонту, калі трэба нешта пачысціць ці крыху падправіць, — тлумачыць захавальнік калекцыі “Жывапіс Беларусі” Ала Васілеўская. — Напэўна, Бялыніцкі-Біруля прытрымліваўся ўсіх неабходных тэхналагічных прыёмаў у жывапісе, таму большасць работ захавалася ў добрым стане, яго калекцыя ў нас — амаль эталонная. Вось, напрыклад, той самы “Час цішыні”. У Магілёў вязуць першы варыянт гэтай работы 1911 года. Усяго іх у нас тры, але менавіта за першы Бялыніцкі-Біруля атрымаў медаль на Мюнхенскім міжнародным фестывалі і бронзавы медаль на Міжнароднай выставе ў Барселоне.

У новых рамах, агорнутыя ахоўнай плёнкай і крафтавым картонам, каб пазбегнуць пашкоджанняў падчас транспарціроўкі, карціны пакуюць у драўляныя скрыні. Праз тры тыдні ўсе ахвотныя змогуць убачыць іх у Магілёве.

І, ЗРАЗУМЕЛА, ІНФАКІЁСК

Бялыніцкі-Біруля ў гэтым горадзе ніколі не быў. Ён нарадзіўся ў Крынках непадалёк ад Бялыніч. Але паколькі яго родны дом не захаваўся, калі абіралі месца для музея, вырашылі, што лепш за ўсё зрабіць яго ў старым двухпавярховым асабняку пад нумарам 37 на пешаходнай вуліцы Ленінскай. Раней увесь першы паверх займала мемарыяльная экспазіцыя — асабістыя рэчы, фотаздымкі і дакументы. Цяпер гэта выставачная прастора для розных часовых праектаў, як і мансарда.

— Так можна прыцягнуць у музей нашмат больш наведвальнікаў, бо іх значная частка — жыхары Магілёва, якім цікава прыйсці ў знаёмае месца і ўбачыць штосьці новае, — кажа Дар’я Барташук. — Мэбля, здымкі і дакументы будуць, толькі не ў такой колькасці, як раней, і ўжо на другім паверсе разам з творамі мастака. Да таго ж, з архівам дакументаў і фатаграфій можна азнаёміцца праз інфакіёск, які ўсталююць таксама на другім паверсе.

У першы дзень працы абноўленага Музея Вітольда Бялыніцкага-Бірулі там адкрыецца часовая выстава “Калі мы былі дзецьмі” — дзіцячыя вобразы ў творах з калекцый беларускага і рускага жывапісу Нацыянальнага мастацкага музея. У кастрычніку яе зменіць праект, які ладзіцца сумесна з Дзяржаўнай Трэцякоўскай галерэяй і прадстаўляе творы мастакоў з блізкага кола Бялыніцкага-Бірулі — Мікалая Багданава-Бельскага, Аляксандра Маравава, Аляксея Сцяпанава ды іншых.

К

Мікалай Міхайлавіч КІРЫЧЭНКА
(16 сакавіка 1946 — 14 жніўня 2018)



Спачуванне родным і блізкім народнага артыста Беларусі Мікалая Кірычэнкі накіраваў Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандр Лукашэнка.

“Прыміце спачуванні ў сувязі са смерцю шчырага і абаяльнага чалавека. Свой лёс Мікалай Міхайлавіч звязаў з мастацтвам, прысвяціўшы яму ўсе душэўныя сілы, талент і натхненне”, — гаворыцца ў спачуванні.

Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што творчая дзейнасць Мікалая Кірычэнкі стала неацэнным укладам у гісторыю сучаснай культуры, з’яўляецца прыкладам для маладых артыстаў, сапраўдным гонарам Нацыянальнага акадэмічнага тэатра імя Янкі Купалы і айчыннага кінематографа, узорам служэння сваёй краіне.

“Светлая памяць пра Мікалая Міхайлавіча назаўсёды застанецца ў нашых сэрцах”, — падкрэсліў беларускі лідар.

Тэатральнае мастацтва Беларусі панесла незаменную страту: памёр народны артыст Беларусі, вядучы майстар сцэны дзяржаўнай установы “Нацыянальны акадэмічны тэатр імя Янкі Купалы” Мікалай Міхайлавіч Кірычэнка.

Мікалай Міхайлавіч з 1971 года працаваў у складзе тэатра імя Янкі Купалы, з 2005 па 2009 гады з’яўляўся яго кіраўніком.

За гады творчасці Мікалай Міхайлавіч стварыў запамінальныя яскравыя вобразы ў спектаклях тэатра імя Янкі Купалы якія цяпер складаюць гісторыю тэатра: Ягайла (“Князь Вітаўт” Аляксея Дударава), Менахем (“Памінальная малітва” Рыгора Горына), Мнішак (“Чорная панна Нясвіжа” Аляксея Дударава), Креонт (“Антыгона” Жана Ануя), Васіль Ігнатавіч (“Зямля Эльзы” Яраславы Пулінові), Лінгстранд (“Жанчына з мора” Генрыка Ібсена) і іншыя.

Нямала ён аддаў рабоце на беларускім радыё і тэлебачанні, здымкам у кінафільмах. На яго рахунку больш за 40 фільмаў, сярод якіх: “У жніўні 44-га…”, “Анастасія Слуцкая”, “Шчыт Айчыны”, “У сузор’е Стральца”, “Паляванне на гаўляйтара”.

Творчая дзейнасць майстра з’яўляецца яркай старонкай у гісторыі нацыянальнага тэатральнага мастацтва, што неаднаразова было адзначана высокімі ўзнагародамі з боку дзяржавы.

Светлая памяць аб выдатным акцёры, чалавеке шырокай душы назаўжды застанецца ў памяці родных, блізкіх, сяброў, калег і шматлікіх гледачоў.

Ю.П. Бондар, І.У. Дрыга, Г.Б. Давыдзька, М.М. Пінігін, П.І. Палякоў, У.М. Карачэўскі, В.С.Манаеў, З.П. Зубкова, А.К. Памазан, трупа Нацыянальнага акадэмічнага тэатра імя Янкі Купалы.

чайнага цуда”, “12 крэслаў”, “Чалавека з бульвара Капуцынаў”. Прычым спяваць не ў адзіноце, а з зоркамі кіно і першымі выканаўцамі хітоў. Адной з фішак Juras Perle сталі доўгачаканыя і зусім нечаканыя дуэты і ансамблі. Беларусы выступілі з Таццянай Абрамавай, Сяргеем Мурзіным, Ганнай Кавальчук, а таксама з Леанідам Сярэбранікавым і Міхаілам Баярскім, якія на працягу дзясяцігоддзяў звязаны творчымі повязямі з маэстра Гладковым.

— Буйныя фестывалі збіраюцца вельмі хутка, можна сказаць, на месцы, бо ўсе ўдзельнікі — занятыя людзі са шчыльным графікам. Таму трэба мець добры прафесійны ўзровень, каб “з колаў” адрэпеціраваць сумесныя нумары, — тлумачыць Дзмітрый Якубовіч. — Прыемна, што і Міхаіл Баярскі — наш партнёр у многіх нумарах, і рэжысёр фестывалю Генадзь Шагаеў, і дырыжор Леў Дунаеў адзначылі наш калектыў як плеяду яркіх артыстаў, з якімі было прыемна працаваць. Вельмі здорава было зразумець на асабістым вопыце, наколькі вялікія прафесіяналы з табой працуюць. Нават нейкія форс-мажоры вырашаліся з гумарам, без капрызаў і нерваў. І калі я за кулісамі збіў Лявона Аганэзава і памяў яму ноты, ён пажартаваў, што я яму надаў дадатковы запал для выступлення. А Валерыя Ланская ў гэты час дапамагала пераапранацца нашым дзяўчынкам, якія не паспявалі да выхаду.

Па словах кіраўніка тэатра, і на сцэне, і за кулісамі склалася атмасфера сапраўднага творчага братэрства, дзе ўсе, нягледзячы на званні, заслугі і медыйнасць, весела гутарылі, дапамагалі адзін аднаму, лёгка і нязмушана вырашалі прафесійныя пытанні.

— “Тэрыторыя мюзікла” ўпершыню пабывала на такім буйным прадстаўнічым фестывалі, — адзначае Дзмітрый Якубовіч. — Калі мы яшчэ толькі рыхтаваліся да паездкі, былі пэўныя сумневы: ці ўпішамся ў фармат, ці будзем адпавядаць узроўню. Але ў выніку ўсё атрымалася настолькі добра і творча прадуктыўна, наколькі гэта ўвогуле магчыма. Было адчуванне, што мы ўсе адзін аднаго даўно ведаем.

Ганна ЗВЯРЫНСКАЯ
Фота Анжалікі ГРЭКОВІЧ

Гадзіна мінула, як прыйшла вестка пра сыход дарагога для мяне народнага артыста Беларусі Мікалая Кірычэнкі. Гэта значыць, што ягоная абаяльная, цёплая, прыязная ўсмешка, іскрынкі ў сумных — асабліва апошнім часам — вачах ужо не сустрэнуць нікога ані на лесвіцах тэатра, ані ў тэатральнай кавярні, ані на мінскіх вуліцах, а галоўнае — на Купалаўскай сцэне.

На развітанне

Фота Юрыя ІВАНОВА

Ён унёс з сабой унівеч словы і пачуцці сваіх герояў, іх моц і слабасць, любоў і мудрасць. Магутнага Крэонта ў чырвоным царскім плашчы, які прамаўляе да Антыгоны з уласцівай толькі яму інтанацыяй болю і роспачы — “Эдыпава пыха! Эдыпава пыха!” Па-рыцарску годнага і пяшчотнага Васіля ў прэм’ерным спектаклі “Зямля Эльзы”. Незабыўнага цяпер Васіля… Сышлі ўнівеч і планы на новы спектакль па п’есе МакДонаха. Я не кажу ўжо пра ранейшыя працы, якія сталі для Купалаўскага тэатра класічнымі. Варта згадаць ягонага Ягайлу ў спектаклі “Князь Вітаўт”! А як я любіла яго выхад на сцэну ў дударэўскім “Вечары”.

Пакуль пісаліся гэтыя радкі, за вакном усчалася неверагодная жнівеньская начная залева з грымотамі і бліскавіцамі. Гэткае развітанне зладзіла прырода з чалавекам яркага тэмпераменту, багатай натуры, мілоснікам жыцця, мужным і адважным змагаром.

Нябеснай спагады Вам, дарагі спадар Мікалай!

Вольга БАБКОВА,
загадчык літаратурна-драматургічнай часткі Нацыянальнага акадэмічнага тэатра імя Янкі Купалы і ўсе купалаўцы

Калонка рэдактара

Стымул для “гаспадара музея”

Ілья СВІРЫН

Каб не заспаць да паўдня, на выхадных заўсёды стараюся кудысьці выбрацца. Гэтым разам і нагода здарылася. У “коласаўскай” Альбуці ўпершыню прайшоў свой фэст — Мядовы Спас. Вуллі ля леснічоўкі месцяцца па-ранейшаму, як і ў тыя часы, калі класік іх натхнёна апісваў у “Новай зямлі”.

Гэты музейны аб’ект на Стаўбцоўшчыне ўражвае ўжо сам па сабе. Сапраўдны засценак, размешчаны пасярод сапраўднага леса. Так, самі пабудовы ў свой час былі адноўленыя з нуля. Але гэта рэдкі выпадак, калі “навадзельнасць” зусім не адчуваецца.

Таму турфірмам варта прыслухацца да прапановы дырэктаркі Коласаўскага музея Зінаіды Камароўскай ды “заварочваць” на Альбуць некаторыя з тых аўтобусаў, што кіруюцца ў Нясвіж. Балазе, і тэматычная звязка аб’ектаў выбудоўваецца: вось так жылі магнаты, а так — іх шараговыя “падданыя”.

Сам фэст атрымаўся па-сапраўднаму народным: камерным, шчырым і зухаватым. Гэтая натуральнасць неяк апраўдвала і пярэстасць рэпертуару: фальклор суседнічаў з рускай эстрадай і нават ламбадай. Але думаю, што і ў часы коласавага юнацтва на фэстах гучала рознае.

Трое гасцей свята вылучаліся нават сваім знешнім выглядам. Тым не менш, выхадцы з Непалу і Чаду вокамгненна ўключыліся ў фэставую кругаверць і не толькі танчылі польку нароўні з астатнімі, але, здаецца, нават выйгралі нейкі прыз. Таму напярэдадні Еўрапейскіх гульняў самы час падумаць пра адмысловыя маршруты для тых турыстаў, якім карціць пазнаёміцца ў гэтай краіне не толькі з меню бліжэйшых да стадыёна бараў. Альбуць для такіх маршрутаў падыходзіць на ўсе сто. Ды і яшчэ знойдзецца з дзясятак такіх мясцінаў, дзе дух аўтэнтыкі не толькі захоўваюць, але і шчодра дзеляцца ім з усімі ахвотнымі.

На сённяшні дзень лясны засценак выглядае нядрэнна: чаротавыя дахі не працякаюць, трава дбайна выкашаная. А экскурсіі, дарэчы, вельмі цікавыя. Але за прывабным для турыстаў фасадам тоіцца нямала праблем — звыклых для падобных “лясных” музеяў.

У свой час усе чатыры “коласаўскія” аб’екты на Стаўбцоўшыне былі аб’яднаныя ў адзіны філіял. Здавалася б, нічога кепскага ў такой цэнтралізацыі няма. Але праблема ўзнікае са штатным раскладам: дэ-факта філіялаў чатыры, а дэ-юрэ ён толькі адзін. Хаця працы тут проста безліч. Ды і ёсць свая спецыфіка, пра якую і не здагадваюцца “гарадскія” музейшчыкі.

— Маладую дзяўчыну я сюды працаваць не пушчу! — безапеляцыйна кажа спадарыня Зінаіда. — Тут і дзікі па лесе сноўдаюць, і здзічэлыя сабакі трапляюцца.

На яе думку, лепей за ўсё, калі такі аб’ект даглядае гаспадарлівая сям’я. Балазе, і ўмовы для гэтага прадугледжаныя: музей валодае і звычайнай хатай (ад турыстаў яна схаваная) для жыцця персаналу. Але дзе ж ты возьмеш тую сям’ю — пры цяперашніх музейных заробках?

Умудроныя жыццём дырэктары ўсімі спосабамі зацягваюць на пасады загадчыкаў такіх філіялаў людзей ініцыятыўных і рукастых — хай і без профільнай адукацыі. Не чыноўнікаў, а сапраўдных гаспадароў. І справа робіцца. Але энтузіязм — гэта той рэсурс, вычарпальнасць якога нават не варта выпрабоўваць. Гаспадарскую жылку добра было б неяк матываваць.

На маю думку, выйсце з сітуацыі можа быць наступным. А што калі паспрабаваць уключыць падобнага кшталту філіялы ў пералік суб’ектаў, якім дазволена займацца агратурызмам? Пакінуць абавязковы спектр музейных паслуг з адпаведным бюджэтным фінансаваннем — і развязаць тым, хто там працуе, рукі ў плане паслуг дадатковых. Хочаш — зрабі для школьнай экскурсіі салодкі стол з духмянымі пірагамі. Дзятва будзе радая ды ў ахвоту заплоціць табе якую капейчыну. Хочаш — прапануй вусатым дзецям паказаць, дзе дзядзька Антось ляшчоў лавіў: можа, там яшчэ засталіся? І не трэба рупіцца пра тое, каб кожны “чых” афармляць юрыдычна. Галоўнае, каб дадатковыя паслугі радыкальна не выпадалі з канцэпцыі музея.

Акурат пры мне ў Альбуці абмяркоўвалася новая задума. Чаму б не пабудаваць ля Нёману прыгожую альтанку, каб маладыя пасля вяселля маглі завітваць туды на фотасесію? Але адразу ўзнікаюць практычныя пытанні. Хто ўкладзе грошы ў будаўніцтва? Хто будзе абслугоўваць? Як гэта ўсё аформіць?

Прарыўны Указ аб агратурызме засведчыў: гаспадароў у нашым краі процьма, і калі даць ім волю, усе рабочыя пытанні вырашаюцца досыць хутка.

К

Толькі адрэстаўраваць — замала

Гэтую велічную старадаўнюю камяніцу ў цэнтры Слоніма старажылы памятаюць пад кодавым найменнем “Рогі і капыты”. Так называлася размешчаная ў яе прыбудове мясная крама. Побач былі галантарэя, “Дываны”, “Малочны бар”, склад мэблі. Магчыма, гэта не самае дыхтоўнае прымяненне для ўнікальнага помніка культавага дойлідства — Вялікай альбо Галоўнай сінагогі. Тым не меней, як паказаў час — лепей, чым нічога. Пасля таго, як камяніца спусцела ды перастала выкарыстоўвацца, яе стан пачаў імкліва пагаршацца.

Толькі ў лютым гэтага года яна займела ўласны праект зон аховы. І гэта пры тым, што такі праект мусіць рэгуляваць штодзённае жыццё не толькі самаго помніка, але і ўсіх навакольных тэрыторый, дзе несупынна віруе рух.

Распрацоўка зон аховы амаль супала па часе з другой, не менш значнай падзеяй у жыцці старой бажніцы. На пасяджэнні Брытанскага парламента быў заслуханы і ўхвалены праект “Гістарычныя сінагогі Еўропы”. У выніку інвентарызацыі больш чым трох тысяч аб’ектаў з 48 краін, арганізаванай брытанскім Foundation for Jewish Heritage, слонімская сінагога трапіла на чацвёртае месца ў спісе найбольш каштоўных іўдзейскіх бажніц Еўропы! Праўда, яе стан эксперты ацанілі як D — “вельмі дрэнны”. Наступная катэгорыя — толькі E: страчаны беззваротна.

Генадзь ВОХІН / Фота аўтара

ЯЎРЭЙСКАЕ БАРОКА

У “кароткі спіс” праекта “Гістарычныя сінагогі Еўропы” патрапіла 19 бажніц, адабраных Яўрэйскім універсітэтам у Іерусаліме па запыце брытанскага фонду. Што характэрна, слонімская біма змешчаная нават на загалоўнай старонцы сайта гэтай ініцыятывы!

Галоўная сінагога Слоніма была пабудаваная ў 1642 годзе з дазволу Уладзіслава IV Вазы на месцы згарэлай драўлянай. Сваім аблічам яна больш падобная на хрысціянскія баракальныя храмы.

— Як сцвярджаюць адмыслоўцы, гэта ледзь не адзіны будынак сінагогі ў стылі барока на тэрыторыі сучаснай Беларусі. І ўнікальнасць яго ў тым, што тут барока менавіта ранняе, — расказвае старшыня дабрачыннай арганізацыі “Дыялог” Артур Ліўшыц. — У нашу каманду ўваходзіць вядомы брытанскі архітэктар Цзыўай Со — аўтар нашумелага праекта беларускай грэка-каталіцкай царквы ў Лондане. Ён лічыць, што сінагога была адным з першынцаў стылю барока на Беларусі і яшчэ не зазнала ўплыву мясцовых архітэктурных школ.

У той самы час дырэктар Цэнтру даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры НАН Беларусі акадэмік Аляксандр Лакотка сцвярджае, што ў архітэктуры былой Галоўнай сінагогі Слоніма яўна прачытваюцца рысы Гродзенскай школы барока. На яго думку, тут можна заўважыць шмат падабенстваў з брыгіцкім і францысканскім кляштарамі ў Гродне і асабліва — з францысканскім касцёлам у Гальшанах.

Сінагога багата аздобленая ўнутраным жывапісам — унікальныя фрэскі дагэтуль пакрываюць сцены. На жаль, частка іх ужо згублена незваротна. На шчасце, яшчэ на пачатку 1990-х гадоў роспіс быў зафіксаваны рэстаўратарамі з творчай майстэрні “Басталія”. Трохі пазней быў наноў перакрыты дах, што замарудзіла працэс руйнавання. Але патрапіўшы ўнутр, няўзброеным вокам бачыш, што ідзе ён усё адно несупынна.

СКЛАД ПАД СКЛЯПЕННЯМІ

У канцы XIX стагоддзя з 15 863 жыхароў Слоніма 11 515 было яўрэямі. У горадзе была 21 сінагога, некалькі дзясяткаў хедараў — пачатковых яўрэйскіх школ, і чатыры ешыботы — вышэйшыя рэлігійныя навучальныя ўстановы. Большасць са ста пяцідзесяці крам у горадзе належылі яўрэям. Адзін час нават выдавалася газета на ідыш “Ды Слонімер Ворт” — “Слонімскае слова”.

— Але пасля навалы Другой сусветнай вайны яўрэйская супольнасць ужо не здолела адрадзіцца, — тлумачыць дырэктарка раённага краязнаўчага музея імя Іосіфа Стаброўскага Алена Сухарукава. — Слонімская яўрэйская грамада цяпер ёсць у Ізраілі, але яе няма ў самім Слоніме!

У савецкі час сякое-такое выкарыстанне для сінагогі знайшлося: пад барочнымі скляпеннямі зрабілі склад мэблі. Да ўсяго, будынак аброс крамкамі, папулярнымі сярод месцічаў.

— У 1987 годзе там яшчэ была крама “Дываны”, дзе я закуплялася для сваёй новай кватэры, — згадвае Алена Сухарукава. — У іншых прыбудовах быў “Малочны бар” — вельмі яго любілі нашы дзеці. А ў суседнім закуточку — ужо бар для дарослых. Таксама вельмі добры. Да пачатку 1990-х усё працавала.

— Сінагога сёння ніяк не выкарыстоўваецца. Натуральна, без пастаяннага дагляду будынак прыходзіць у заняпад, — распавядае намесніца старшыні Слонімскага райвыканкама Кацярына Рут-

коўская. — Але ж у будынку не было перабудовы і перапланіровак, у даволі добрым стане захаваліся фрэскі. І ў гэтым — унікальнасць помніка! Да таго ж, бажніца для нас уяўляе вялікую каштоўнасць яшчэ і з гістарычнага пункту гледжання — гэта памяць пра зніклую гісторыю нашага горада. Аднак трэба не проста адрэстаўраваць будынак, але і напоўніць яго новым жыццём. Толькі так ён здолее захавацца.

БОЛЬШАСЦЬ — ЗА МУЗЕЙ

Як расказвае Артур Ліўшыц, захады па аднаўленні Слонімскай сінагогі пачаліся яшчэ нават да ўключэння яе ў міжнародны праект — пасля таго, як у "Дыялог" звярнулася сям'я Каплінскіх з Вялікабрытаніі, продкі якіх паходзяць са Слоніма. Аднак праект па аднаўленні сінагогі — вялікі, доўгатэрміновы і, што самае праблемнае, вельмі дарагі. Пакуль зроблены толькі першыя крокі ў гэтым кірунку.

— Ужо праведзена тэхнічнае абследаванне камяніцы і сабрана палова неабходных сродкаў на правядзенне работ па кансервацыі будынку, — распавядае Артур Ліўшыц.

Знаходжанне ў шортлісце сінагог Еўропы — не проста пачэсны статус. Гэта яшчэ і шанец атрымаць фінансаванне на рэстаўрацыю. Ужо распачаты міжнародны праект па зборы сродкаў, якім займаецца брытанская асацыяцыя The Together Plan.

Артур Ліўшыц пагаджаецца з Кацярынай Руткоўскай: проста адрэстаўраваць — мала. Трэба, каб камяніца жыла!

Што будзе размешчана ў ёй пасля аднаўлення — пакуль яшчэ пытанне. Але накіды ўжо ёсць. Бадай усе пагаджаюцца з тым, што ў першую чаргу гэта павінен быць музей.

— Літаральна пару тыдняў таму мы мелі чарговую працоўную сустрэчу, падчас якой абмяркоўвалі планы па развіцці сінагагальнага комплексу, — расказвае спадарыня Руткоўская. — І сышліся на меркаванні, што гэта не павінна быць, уласна, сінагога, хаця прадугледжаны і памяшканні для правядзення набажэнстваў. Бо зразумела, што нават калі ў будучыні і адрадзіцца ў Слоніме свая яўрэйская грамада, яна наўрад ці здолее ўтрымліваць такі вялікі будынак. Таму трэба ствараць музей, які стане прывабным турыстычным аб'ектам.

— Фактычна, у нас няма музея гісторыі яўрэяў, няма музея, які паказаў бы трагедыю Халакосту, — дадае Артур Ліўшыц. — І гэта ў краіне, на тэрыторыі якой падчас Другой сусветнай вайны была знішчана фактычна адна шостая частка ўсіх забітых яўрэяў Еўропы! Мяркую, гэтая тэма — і гісторыя нашага народа, і гісторыя яго трагедыі, — вартая ўласнага музея.

Іншая справа, чым яго напоўніць. Звычайна аргтрупа па стварэнні новага музея працуе не адзін год — пішацца навуковая канцэпцыя, распрацоўваецца архітэктурна-мастацкае рашэнне будучай экспазіцыі і, самае галоўнае, ідзе збор экспанатаў.

На жаль, разлічваць на фонды слонімскага краязнаўчага музея тут не выпадае — у яго зборы не так і шмат прадметаў па тэме. Больш за тое, як растлумачыла галоўная захавальніца музея Наталля Рудкевіч, амаль усе яны — фрагменты Торы, традыцыйнае рытуальнае адзенне яўрэяў — кіпа, тфілін і талес, срэбная мезуза, якая мацавалася на ўваходных дзвярах у яўрэйскі дом, кавалак ключага дроту са слонімскага гета, — ужо выстаўленыя ў экспазіцыі.

— Тора, якую мы дэманструем на выставе рэдкай іконы і кнігі, была знойдзена ў нашай сінагозе і падараваная музею. Гэта амаль дэтэктыўная гісторыя: прыйшла жанчына і сказала, што нейкія людзі прасілі перадаць. Вось так гэты фрагмент Торы перадаваўся з рук у рукі і, нарэшце, патрапіў да нас, — расказвае спадарыня Рудкевіч. — Ёсць вельмі цікавыя фотаздымкі — яшчэ са збораў самаго Іосіфа Стаброўскага. Але, на жаль, у нас у фондах недастаткова музейных прадметаў для пабудовы паўнавартаснай экспазіцыі па гісторыі яўрэйскага Слоніму.

— Зрэшты, пакуль гэта ўсё — толькі на стадыі абмеркавання: працоўная група па арганізацыі музея нават яшчэ не створаная, — дадае дырэктарка музея Алена Сухарукава. — Нават дакладна невядома, у якой форме ён будзе арганізаваны і ці будзе гэта самастойны музей або філіял нашага.

Адным з самых важных у развагах пра перспектывы музеефікацыі слонімскай сінагогі з'яўляецца пытанне, хто стане яе галоўным наведвальнікам. Спадар Ліўшыц лічыць, што гэты музей павінен быць цікавым і яўрэям, і беларусам, сведчачы пра іх шматгадовую супольную гісторыю. Да таго ж, нашчадкі колішніх тутэйшых літвакоў — як называюцца яўрэі з гэтых мясцінаў — усё часцей наведваюць радзіму сваіх продкаў.

Са спадаром Ліўшыцам пагаджаецца і начальнік аддзела культуры Галіна Данільчык. Яна распавяла, што паколькі тэма сінагогі ўвесь час актуальная ў Слоніме, не так даўно сярод яго жыхароў было праведзена сацыялагічнае апытанне.

— Мы хацелі даведацца, якую будучыню для былой сінагогі хацелі б бачыць мясцовыя жыхары. І часцей за ўсё чулі ў адказ — "музей"! — распавядае спадарыня Данільчык.

Без сумневу, музей значна павялічыць і турыстычны патэнцыял Слоніма. Тым болей, для мясцовых уладаў гэтая праблема актуальная.

Не сакрэт, шмат хто з турыстаў наведвае Жыровіцкі манастыр, але нават не заязджае ў суседні Слонім. Спадзяемся, калі сінагога будзе адрэстаўраваная, колькасць турыстаў вырасце нават не ў разы, а ў дзясяткі разоў, — дзеліцца планамі намеснік старшыні райвыканкама. — І гэта пацягне развіццё суправаджальнай інфраструктуры — гатэляў, сістэмы харчавання. Нас у нашых спадзяваннях падтрымліваюць эксперты — і беларускія, і замежныя.

■■■

Зрэшты, казаць пра перспектывы пакуль варта з пэўнай асцярожнасцю. Сродкаў на рэстаўрацыю — а гэта сума, як мінімум, сямізначная — на сёння няма. Тым не меней, Артур Ліўшыц поўны аптымізму:

— У нас вельмі моцная каманда — архітэктары, будаўнікі, фандрайзеры, піяршчыкі. Ім ужо даводзілася працаваць на самых розных праектах, у тым ліку і даволі буйных — ад Нью-Ёрку і Лондану да маскоўскага Крамля. Да канца восені плануем завяршыць вонкавыя работы — узімку тады можна было б камфортна праводзіць і ўнутраныя. Да рэстаўрацыі мы спадзяемся прыцягнуць сур'ёзных спецыялістаў з-за мяжы, якія спецыялізуюцца, напрыклад, на захаванні фрэсак. Справа ў тым, што ў Беларусі такіх адмыслоўцаў вельмі мала. Таму наш праект — гэта яшчэ і магчымасць абмену досведам, калі сюды будуць прыязджаць, скажам, англійскія рэстаўратары, а нашы — ездзіць у Брытанію для павышэння кваліфікацыі.

На наступны год запланавана і правядзенне валанцёрскіх летнікаў. Мяркуецца, што ў іх возьме ўдзел не толькі моладзь з яўрэйскіх арганізацый, але і беларусы са Слоніма.

А на пытанне, за які ж прыблізна час ёсць надзея аднавіць сінагогу ў яе колішняй велічы, спадар Ліўшыц адказвае:

— Мяркую, агулам усё зойме чатыры — пяць гадоў. Але гэта пры тым, што не будзе праблем з фінансаваннем.

К

Дарэчы

Як ні дзіўна, суседні будынак з Галоўнай сінагогай Слоніма — Малая слонімская сінагога — захаваўся ў лепшым стане. Відавочна, гэта здарылася таму што ён не быў закінуты. Камяніца ўваходзіць у ахоўную зону Вялікай сінагогі, аднак статусу гісторыка-культурнай каштоўнасці не мае. Як адзначыў аўтар праекта зон аховы Зміцер Савельеў, напэўна, у свой час не было жадання ўключаць яе ў Дзяржспіс. Хаця адметнасць — відавочная.

— Заходзіш у мэблевую краму, а там пасярэдзіне біма, — месца на ўзвышэнні ў цэнтры сінагогі для чытання Торы, — падзяліўся сваімі ўражаннямі архітэктар-рэстаўратар.

Магчыма, пры рэстаўрацыі Вялікай сінагогі варта было б звярнуць увагу і на Малую — відавочна, яны ўтвараюць калі не архітэктурны, дык гісторыка-культурны ансамбль. Тым больш, што гаворка ідзе пра рэнавацыю ўсёй прылеглай тэрыторыі і стварэння там цэнтру культурнага жыцця цяперашняга Слоніма.

Дзяжурны па нумары

Танцы на бацькоўскай спіне

На тое, што школа XXI стагоддзя перакладвае частку сваёй работы на бацькоў, не наракаў толькі гультай. І пра бацькоўскія сходы, дзе настаўніцы пад запіс патрабуюць фіксаваць, якія параграфы неабходна дома вывучыць, і пра хатнія заданні, што без націску дарослых не выконваюцца на неабходным для кантрольных паказчыкаў узроўні, перагаворана шмат. Аднак кепская тэндэнцыя па перакладзе сваёй адказнасці на чужыя плечы пачала пераносіцца і ў сферу харэаграфічнай адукацыі.

Настасся ПАНКРАТАВА

Харэаграфічных гурткоў і аддзяленняў пры школах мастацтваў у любым буйным беларускім горадзе заўсёды было багата. За апошнія дзясяцігоддзі як грыбы павырасталі прыватныя студыі балета, школы танцаў на стыку спартыўных і класічных кірункаў, а таксама гімнастычныя секцыі з абавязковай харэаграфіяй у раскладзе заняткаў. Самыя паспяховыя абраслі філіяламі. Прыток ахвотных запаліць у сваіх дзецях зорку Тэрпсіхоры год ад году павялічваецца. Магчыма, у знакі даецца той факт, што цяперашнія педагогі перасталі трымаць дзяцей адно ля станка, а рэгулярна выводзяць сваіх падапечных на канцэртныя пляцоўкі, з другога — трэцяга года навучання вязуць за мяжу на міжнародныя конкурсы.

Здавалася б, адпрацаваная гадамі схема дае вынік: педагог займаецца з дзецьмі ў класе, даводзіць ім неабходны набор харэаграфічных элементаў, самыя ўпартыя і здольныя навучэнцы адбіраюцца ў канцэртны склад і выходзяць на сцэну. Аднак у новых рэаліях некаторыя харэографы абралі іншую стратэгію: на бацькоўскім сходзе яны абвяшчаюць, чаму за год павінны навучыцца дзеці, а кантраляваць выкананне даведзеных патрабаванняў мусяць бацькі. Інакш іх дзіця, якое не села на шпагат / не выканала гранд батман / не стала на "мосцік", будзе бязлітасна адлічана ці катэгарычна не дапушчана да пастаноўкі канцэртнага нумару. У класе патрэбныя элементы паказваюцца некалькі разоў, а вось замацаваць іх (а часта — спачатку паставіць) неабходна дома.

Летась з такімі патрабаваннямі сутыкнулася і я. Да таго, як змяніць школу, па інерцыі паўгады штодня займалася з пяцігадовай дачкой, расцягвала яе, ставіла правільную тэхніку, дапамагала разабрацца, куды павінны глядзець калені ды пяткі пры выкананні пэўных рухаў. І ўпарта адганяла ад сябе простае пытанне: чаму гэтым займаюся я, а не педагог, да якога маё дзіцё прыходзіць тры разы на тыдзень і праводзіць у зале па паўтары гадзіны? Прамаўчу тут пра грошы (і не малыя!), якія рэгулярна пераходзілі з маёй кішэні на рахунак навучальнай установы. Добра, асабіста ў мяне ёсць харэаграфічная адукацыя. А што рабіць тым, хто ніколі танцамі ці спортам не займаўся — а значыць, не ведае, як паставіць рух, не нашкодзіўшы пры гэтым малечы?

Нясмела пачала распытваць бацькоў ля распранальні. І на мяне валам пасыпаліся гісторыі. У адной сям'і тата і мама ледзь не пасварыліся, бо ніхто не разумеў, як навучыць дачку рабіць "кола". У другой пачалі шукаць дапамогі "з боку", бо за паўгады дзіця ні на крок не наблізілася да затрабаванага мінімуму. У трэцяй выратоўвала сітуацыю з пастаноўкай элементаў маці, якая на месяц кінула ўсе свае хатнія справы.

Чакайце, але навошта тады нам педагог? Канешне, з гатовым матэрыялам лягчэй працаваць, аднак ці надоўга хопіць энтузіязму і ўменняў тых, хто недасведчаны ў харэаграфічнай справе? Што будзеце рабіць потым?

Магчыма, хтосьці карыстаецца пасылам "выжыве мацнейшы". Толькі за час прафесійнага патурання можна "напрацаваць" неслабыя фізіялагічныя праблемы. Дарослым застанецца развесці рукамі: чаму цалкам здаровае дзіця праз год — два заняткаў па ўмацаванні грацыі раптам пачало падварочваць нагу, хадзіць на дыбачках, дзіўна трымаць спіну. А прычына ўсяго толькі ў тым, што мышачны гарсэт "запомніў" ненатуральныя позы, якія прымаў танцор, спрабуючы выканаць патрабаванне, але элементарна не ведаючы тэхніку. Бо тая самая зона адказнасці харэографа была перакладзеная на недасведчаных у такіх нюансах бацькоў.

К

Не арыентавацца на трэнды

Яна лічыцца адным з самых паспяховых беларускіх жывапісцаў новага пакалення. Прынамсі, Алеся СКАРАБАГАТАЯ мае шчаслівую магчымасць рабіць выключна тое, што даспадобы ёй самой! Скончыўшы пяць гадоў таму Беларускую дзяржаўную акадэмію мастацтваў, яна цяпер у ёй выкладае, сумяшчаючы гэта з актыўным удзелам у арт-жыцці. Пра яго асаблівасці мы і гаворым.

Занатаваў Пётра ВАСІЛЕЎСКІ / Фота Сяргея ЖДАНОВІЧА

— Тры гады запар вы атрымлівалі на "Восеньскіх салонах" прыз сімпатый публікі. Тым часам, журы вылучала работы зусім іншага характару і стылістыкі. Чым вы патлумачыце такое разыходжанне ў густах прафесіяналаў ад мастацтва і паспалітых гледачоў?

— Мэта згаданых салонаў, як я разумею, — падтрымаць таленавітую моладзь, якая шукае сваю самасць, эксперыментуе з формай і колерам, з рознымі тэхнікамі і тэхналогіямі. Інакш кажучы, дбае пра эфектную форму самавыяўлення. Што датычыць мяне, дык я мастак, які больш-менш вызначыўся са сваімі поглядамі і эстэтычнымі прыярытэтамі. Відаць, менавіта гэта імпануе грамадзе. Акрамя таго, у аснове мастацтва, якое сёння лічыцца сучасным, — разумовы расклад. Яно — ад галавы. Мае ж карціны больш пачуццёвые. І гледачам гэта даспадобы.

— Як бы вы акрэслілі сваё творчае крэда?

— Любое вызначэнне ёсць абмежаванне. Да таго ж, творчасць не заўжды можна патлумачыць. Калі ж даць нейкую назву таму, што я раблю, і пры гэтым не паглыбляцца ў нетры, дык я рэаліст. Прыхільнік прадметнага мастацтва і прафесіяналізму на базе акадэмічнай школы.

— Адзін мастак, які часта бярэ ўдзел у міжнародных пленэрах, кажа, што ў апошнія гады зноў абуджаецца цікавасць да рэалізму ў яго звыклым разуменні.

— Думаю, раней ці пазней выяўленчае мастацтва на глабальным узроўні мусіць вярнуцца да рэалізму. Бо тое, што адбываецца цяпер, не можа доўжыцца вечна. Калі-нікалі мне падаецца, што традыцыйныя каштоўнасці спляжаны дашчэнту, кропка пастаўлена. Куды далей дэградаваць, я нават і не ўяўляю. Мы дасягнулі дна і мусім ад яго адштурхнуцца. А значыць, пачнецца адраджэнне.

— У апошнія гады, наколькі я ведаю, у навучальным працэсе акадэміі адбыліся змены. Іх мэта — даць студэнтам уяўленне пра эстэтычныя навацыі і сучасныя тэхналогіі. Спадзяюся, гэта адбываецца не за кошт страты пазіцый акадэмічнай школы?

— Наша навучальная праграма на дадзены момант дастаткова згарманізаваная, каб падрыхтаваць творчую асобу, здатную самастойна вызначыць, якім шляхам ёй рухацца. Акадэмічная школа мусіць быць так ці іначай — нават калі чалавек потым будзе займацца абстрактным мастацтвам. Калі такая школа ёсць, гэта адразу адчуваецца. Яе адсутнасць таксама адразу відаць. Я магу паглядзець на абстрактную работу і зразумець, ёсць у аўтара акадэмічная адукацыя ці ён самавук.

Студэнты могуць мець зусім іншыя эстэтычныя арыенціры, чым выкладчык. Гэта натуральна. Але ў сваім узросце яны яшчэ не разумеюць, што насамрэч ім спатрэбіцца ў жыцці і творчасці. І тут ужо вялікая адказнасць настаўніка, які мусіць убачыць, на што здольны вучань, накіраваць яго на той шлях, дзе ён у найбольшай ступені рэалізуе свой талент. Ну і, зразумела, мы павінны даць нашым студэнтам выверанымі часам веды і навыкі.

Я выкладаю на кафедры манументальна-дэкаратыўнага мастацтва, дзе калісь сама і вучылася. Са свайго досведу дадам, што манументаліст па вызначэнні — дысцыплінаваны творца. Гэта значыць, ён умее працаваць у камандзе, кантактаваць з архітэктарам, падпарадкоўвацца абставінам і выкарыстоўваць іх на сваю карысць.

— Я калісьці чуў вызначэнне "папяровы манументалізм". Так Гаўрыла Вашчанка, які ў свой час згаданай кафедрай кіраваў, называў дыпломныя работы, не разлічаныя на рэалізацыю.

— Але значная частка рэалізуецца. Мне, напрыклад, пашчасціла. Мая дыпломная работа "Дзень і ночь" рабілася для беларускага пасольства ў Азербайджане. Там яна цяпер і знаходзіцца.

— Я чуў, што беручы да ўвагі значнасць аб'екта, эскізы дыптыха дасылалі карыфеям мастацтва Азербайджана, каб пачуць іх меркаванні. І азербайджанцы былі ў захапленні.

— Тады мая работа мяне задавальняла, сёння штосьці ў ёй я бы перайначыла. Так заўжды бывае, калі глядзіш на зробленае табою праз пэўны час. Сутнасна мой дыптых манументальны, хаця па тэхніцы з'яўляецца станковай карцінай. Бо інтэграваны ён у канкрэтную прастору. Мне хацелася сумясціць жывапіс з манументалізмам. І, як падаецца, нешта атрымалася.

— У дыпломе беларускія рэаліі вы спалучылі з фантастыкай. Даніна модзе, альбо гэтага вымагала канцэпцыя твора?

— Мне хацелася, каб твор меў не толькі эфектнае ўвасабленне, але і філасофскі змест. Каб не толькі ўвагу прыцягваў, але і думкі вярэдзіў. Таму нашы помнікі дойлідства прадстаўлены на карцінах дыптыха ў містычным святле.

— Вы паводле адукацыі манументаліст, а працуеце як станкавіст…

— Манументальным жывапісам я таксама займаюся.

— Калі яно так, чаму грамада не ведае?

— Таму што як манументаліст я працую па прыватных замовах.

— Калі я быў рэцэнзентам на кафедры манументальна-дэкаратыўнага мастацтва, сярод дыпломных работ трапіла аздоба асабняка недзе ў Расіі.

— Як па мне, дык лепей усё ж працаваць не на прыватную асобу, а на грамаду. І адказнасць большая, і маштаб іншы, і няма залежнасці такой ад хуткаплыннай моды. Цяпер, дарэчы, у модзе мінімалізм. У інтэр'еры даміную белая сцяна. Калі роспіс і прысутнічае, дык таксама ў стылі мінімалізму. Гэта зусім не тое, што было калісьці — цэлую сцяну распісаць нейкімі цяжкімі формамі. Яшчэ бываюць такія заказы, але рэдка.

— Ад Уладзіміра Зінкевіча я чуў, што ў савецкі час манументальнае мастацтва прыкрывала хібы архітэктуры, ператвараючы стандартныя пабудовы ва ўнікальныя аб'екты. А сёння, мауляў, архітэктура ў значнай ступені самадастатковая. І для архітэктара сябра ўжо не манументаліст, а дызайнер.

— Мабыць, ён мае рацыю. У прынцыпе. Але ж я бачу, што імкненне да мінімалізму захапіла і архітэктуру. Архітэктурныя формы і так вельмі простыя, а робяцца ўсё прасцей і прасцей. Дом — у выглядзе кубіка. Спрашчэнне ў выяўленчым мастацтве, спрашчэнне ў архітэктуры. Я ўсё ж спадзяюся, што з'явіцца — хай на новай тэхналагічнай аснове і з новай эстэтыкай — архітэктура складаных форм, насычаная эмацыянальнасцю. І, адпаведна — манументальнае мастацтва, зместам і формай гэтай архітэктуры адпаведнае.

— Выкладчыцкая праца творчасці не перашкаджае?

— Праца ў акадэміі для мяне каштоўная. Бо гэта пастаяннае прафесійнае сумоўе, і не толькі са студэнтамі. З выкладчымі таксама, і нават у першую чаргу

— І акно ў свет пасля творчага пустэльніцтва ў майстэрні?

— І гэта таксама.

— А вы можаце, гледзячы на студэнта вызначыць, што з яго атрымаецца?

— Часцей за ўсё, так. Творчая перспектыва студэнта залежыць у большай ступені не ад узроўню падрыхтоўкі, з якім ён прыходзіць у акадэмію, а ад ягонага характару.

— Ад таго, наколькі ён здольны прабіцца па жыцці і сваё давесці?

— Стрыжнявая якасць для мастака — працаздольнасць. Але ж талент таксама мусіць быць. Пры тым, што не надта выразныя здольнасці можна развіць праз працу. А калі лайдачыць, дык і выдатныя страціш. І яшчэ мастаку нельга без самакрытычнасці. Калі ў чалавека амбіцыі зашкальваюць, гэта перашкаджае яму развівацца, вядзе ў тупік. З такога студэнта наўрад ці што атрымаецца. Хутчэй за ўсё, аднойчы ён "псіхане" і сыйдзе.

— Вам не здаецца, што сур'ёзнае мастацтва сёння не запатрабаванае, і гэта адбываецца на ўзроўні абітурыентаў?

— Не. Яно не перастала быць патрэбным. Але ўзровень студэнтаў і сапраўды ніжэй, чым быў, калі вучылася я. З чым гэта звязана? Можа, з наяўнасцю лёгкага доступу да інфармацыі. Навошта над чымсці галаву ламаць, ведаў набірацца, навыкі засвойваць, калі можна ўсё з Сеціва ўзяць. Бачу, што часам студэнты імкнуцца найперш кагосьці здзівіць, а не навучыцца чамусьці карыснаму. Да прыкладу, акадэмічнаму малюнку. І пачынаецца гэта яшчэ ў мастацкай школе, каледжы.

Бывае, бачыш работу на выставе. Нібыта, прыкольна. А потым з залы выйшаў — і забываеш. Бо яно не ад сэрца — ад розуму. Ведаеце, па маіх назіраннях, у Еўропе ўжо не засталося годных рэалістаў. Памятаю велізарную выставу ў парыжскім Гран-пале. Там прадстаўлены ўвесь свет — Еўропа, Амерыка, Кітай... І каб за што было воку зачапіцца!

— А вам самой ніколі ні хацелася гледачоў здзівіць?

— Не. Гэта не маё. Я пра гэта нават не думаю. Проста, раблю тое, што мне падабаецца. Падладжвацца пад моду, пад трэнд... Я так не магу. Нават жадання няма.

— А ці можна быць арыгінальным у глабальным свеце з непазбежнай уніфікацыяй запытаў і прапаноў?

— Канешне. Як мінімум, для гэтага трэба не імкнуцца трапіць у трэнд, а рабіць тое, што цікава менавіта табе.

— Як вы ставіцеся да сацыялістычнага рэалізму?

—Я застала толькі ягонае водгулле+. Мастакі выяўлялі свой час як маглі. Сумленна. Было там нешта грунтоўнае, чаго няма цяпер. Ідэйны змест у мастацтве сёння заменены інфармацыйным кантэкстам.

— Можа, сёння жыццё занадта добрае для мастацтва?

— Наўрад ці.

— Я маю на ўвазе, што ў творчасць часта прыходзяць людзі, якія з нейкіх прычын не могуць знайсці сябе ў рэальным жыцці, і яны ствараюць для сябе свет віртуальны. Можа, сёння няма патрэбы ў эмацыянальна насычаных творах?

— Патрэба ў гэтым, больш ці менш выяўленая, ёсць заўжды. Можа, няма сіл, няма творчай волі, каб перадаць свае пачуцці. Чалавек, які прайшоў вайну, напіша такое палатно, што мурашкі па скуры. А цяпер няма такога, каб мяне да глыбіні душы прабрала.

— Як у мастака, у вас ёсць нерэалізаваная пакуль мара?

— Пакуль няма. Але я адчуваю, што мне трэба зрабіць нешта важнае не толькі для мяне. Дзе гэта будзе, што гэта будзе — не ведаю. Трэба зыходная задача, дзеля якой варта ахвяраваць сваім часам і матэрыяльным станам. Калі надарыцца магчымасць цалкам аддаць, скажам, год адной рабоце, тады яно і адбудзецца.

К

Новае жыццё радыёспектакляў

Радыёспектакль — найвышэйшы пілатаж, сукупнасць усіх навыкаў і лепшых прафесійных якасцяў радыйшчыкаў. На жаль, на мяжы тысячагоддзяў айчынная традыцыя гэтага жанру на Беларускім радыё амаль перарвалася. І ўсё ж, знайшліся тыя, хто не мог дапусціць, каб унікальны досвед нацыянальнай культуры знік. Пасля зацішша на пачатку нулявых радыёспектаклі пачалі ўзнікаць у эфірнай прасторы. І вось ужо канал "Культура" зладзіў конкурс сучаснай п'есы "Беларускі радыётэатр у XXI стагоддзі", які дорыць надзею на вяртанне на былыя пазіцыі ў эфіры адмысловага прадукту вышэйшага гатунку.

Настасся ПАНКРАТАВА

ЗМЯЛЬЧЭЛАЕ МОРА

У многіх краінах свету само паняцце "радыёспектакль" не выклікае здзіўленага ўзняцця броваў, што стала назіраецца ў айчыннай публікі. Напрыклад, у суседзяў існуе адмысловая рэдакцыя "Тэатр польскага радыё", дзе стварэнне такіх пастановак пастаўлена на паток. Ці возьмем Вялікабрытанію (глядзіце "К" № 8 за 2018 год): на канале BBC штодня выходзіць па тры новыя эпізоды пастановак, чый тэматычны дыяпазон досыць шырокі — ад палітычна арыентаваных драм да інсцэніровак класікаў.

У беларускіх рэаліях усе размовы пра пастаноўкі ля мікрафона хутка збочваюць у слыннае мінулае. Ганарыцца сапраўды ёсць чым: літаратурна-мастацкае вяшчанне распачынала свой шлях амаль з першых дзён заснавання Беларускага радыё. Пачыналася ўсё з прамых эфіраў, калі ў студыі акцёры разыгрывалі перад мікрафонам тыя спектаклі, якія ўжо ішлі ў тэатрах. У 1930-х гадах радыйшчыкі перайшлі да адмысловых інсцэніровак нацыянальнай і замежнай літаратуры.

— Такім чынам выкрышталізоўваўся беларускі радыётэатр. Да 1990-х -- пачатку 2000-х мы мелі выдатную школу, — распавядае "К" намеснік дырэктара канала "Культура" Беларускага радыё Уладзімір Трапянок. — Напрыклад, тры дзясяцігоддзі на радыё працавала легенда беларускага эфіру Соф'я Гурыч — рэжысёр, якая зрабіла больш за дзвесце паўнавартасных радыёспектакляў. Сваім досведам з маладымі дзяліўся мэтр мастацкага вяшчання Ігар Лапцінскі. Дарэчы, яго вучнем быў Алег Вінярскі — адзін з тых нямногіх, хто застаўся на радыё і сёння. Аднак дзевяностыя сталіся ліхімі і для радыёэфіру. Змянялася палітыка вяшчання, літаратурна-мастацкія перадачы выцясняліся інфармацыйнымі і перадачамі іншых жанраў кшталту ток-шоу. Напачатку 2000-х у Доме радыё пачалося тэхнічнае пераўзбраенне ў сувязі з пераходам на камп'ютарнае вяшчанне. Тая рэканструкцыя і перарвала традыцыю: легендарны драмблок закрылі на рэканструкцыю.

ПЕРААДОЛЬВАЮЧЫ ПУСТЭЧУ

Спадар Трапянок высветліў, што на працягу пяці гадоў у айчынным эфіры не прагучала ніводнай арыгінальнай пастаноўкі. Праўда, ад знікнення мастацкае вяшчанне выратоўвала літаратура: у прамым эфіры ладзіліся кніжныя чытанні. Этап адраджэння беларускага радыётэатра распачаўся ў 2006 годзе: да 20-й гадавіны катастрофы на Чарнобыльскай АЭС быў пастаўлены "Ігнатаў рубеж" па п'есе гомельскага драматурга Васіля Ткачова. З таго часу раз — два на год Беларускае радыё радуе сваіх прыхільнікаў пастаноўкамі ля мікрафона.

— Шаснаццаць гадоў таму быў утвораны канал "Культура". Дык дзе, як не на спецыялізаванай хвалі працягваць назапашаны нашымі легендарнымі папярэднікамі досвед у справе пастаноўкі радыёспектакляў? — узрушаны спадар Уладзімір. — Так, нам спатрэбілася нямала цярпення, каб даказаць слушнасць нашай прапановы, вырашыць фінансавыя пытанні. Але намаганні таго каштавалі: у сакавіку на нашым канале адбылася прэм'ера дзіцячага радыёспектакля "Падарожжа ў краіну мурашоў".

Радыёпастаноўку па п'есе Таццяны Мушынскай рабіла цудоўная каманда: рэжысёр Ліка Пташук, гукарэжысёры Валерый Бяляеў і Сяргей Бутоўскі, кампазітар Аляксандр Літвіноўскі, а таксама акцёры сталічных тэатраў Святлана Цімохіна, Таццяна Ражаўская, заслужаны артыст Рэспублікі Беларусь Аляксандр Шароў. Спадар Трапянок спадзяецца, што першы ўдалы крок дазволіць каналу "Культура" адрадзіць традыцыю беларускіх радыёпастановак для дзяцей.

Фота Ганны ВАСІЛЕЎСКАЙ

УКЛЮЧЫЦЬ СВЯТЛО Ў ЭФІРЫ

Вясновы поспех з новай сілай акрэсліў знаёмую праблему: для радыёпастановак на блізкія сучаснаму пакаленню тэмы не хапае адмысловай драматургіі. Зняць вастрыню пытання канал "Культура" паспрабаваў конкурсам сучаснай п'есы "Беларускі радыётэатр у XXI стагоддзі", які ладзіў пры падтрымцы Цэнтра беларускай драматургіі , што працуе пры РТБД. Да разгляду прымаліся арыгінальныя творы, нідзе да гэтага не апублікаваныя. У выніку журы атрымала больш за дзясятак п'ес. Праўда, далёка не ўсе з удзельнікаў змаг лі адчуць спецыфіку жанру, звязанага з эфірам.

— Радыётэатр — мастацтва акустычнае. Яму ўласцівы тры важныя выяўленчыя сродкі: драматургія тэксту, музыка і шумавое аздабленне, — тлумачыць спадар Уладзімір. — Тут існуюць свае законы пабудовы тэксту: як праз дыялогі перадаць змены, што адбываюцца з героямі, як затрымаць увагу слухача, які прызвычаіўся да сучаснага мільгацення інфармацыі, як пазначыць змену дзеяння. Радыёдраматург мусіць бачыць тое, што ўтворыцца ў выніку. Таму крыху дзіўна было чытаць у конкурсных матэрыялах рэ-маркі накшталт "на сцэне запальваецца святло".

З-за такіх акалічнасцяў журы было вырашана не прысуджаць 2 і 3 месца. Найлепшай жа суддзі назвалі п'есу Ягора Конева "Танец з рапірай". Гісторыя пра дзяўчыну, якая дасягае мары ўзысці на спартыўны Алімп, будзе пастаўлена да канца года на канале "Культура", а пасля радыёспектакль папоўніць фонды Беларускага радыё.

— Высокую ацэнку заслужыла таксама п'еса Васіля Ткачова "Мелодыя глінянай скрыпкі". Расповед пра маладых людзей на вайне не стасаваўся з заяўленымі тэмамі, таму гэтаму твору прысуджаны ўсяго толькі спецыяльны дыплом радыёконкурсу. Аднак мы вырашылі запланаваць яго пастаноўку налета, калі краіна будзе адзначаць 75-годзе вызвалення аб нямецка-фашысцкіх захопнікаў, — зазначыў Уладзімір Трапянок, які з'яўляўся каардынатарам конкурсу.

На думку суразмоўцы, падобныя конкурсы варта праводзіць на пастаяннай аснове. Толькі такім чынам атрымаецца дапамагчы драматургам адчуць спецыфіку радыёвяшчання.

ПЛЫНЬ У НОВЫМ КІРУНКУ

Дзякуючы конкурсу аўдыторыя гарантавана пачуе ў бліжэйшыя гады яшчэ два радыёспектаклі. А хацелася б, каб мы віншавалі радыйшчыкаў з прэм'ерай куды часцей... Разумею, запіс пастаноўкі — справа не толькі тэхнічна складаная, але яшчэ і досыць накладная. У рабоце задзейнічана вялікая каманда, якая складаецца з рэжысёра, рэдактара, гукарэжысёра, акцёраў. Дарэчы, колькасць апошніх для конкурсу дакладна акрэслівалася — не больш за восем чалавек. Каб усё ж упісацца ў фінансавы каштарыс. Дадайце сюды спецыяльна пад праект замоўленую ў кампазітара музыку — і стане зразумелым, чаму аддаецца перавага музычнаму вяшчанню.

Можна, канешне, пайсці лягчэйшым шляхам, каб знізіць выдаткі: скараціць колькасць задзейнічаных асоб, браць музыку з архіва, перайсці на монаспектаклі, у якіх будуць задзейнічаны адно рэжысёр, гукарэжысёр і выканаўца. Але такі падыход тут жа адаб'ецца на якасці і "відовішнасці" пастаноўкі. А галоўнае, шкада ўсіх тых напрацаваных мэтрамі айчыннага мастацкага вяшчання дасягненняў, якія так проста згубіць канчаткова, калі не змяніць сваё стаўленне да гэтага жанру.

Мне падаецца, радыёспектаклі маглі б стаць сапраўды запатрабаванымі, калі б не толькі асядалі ў фондах, але і атрымалі жыццё як самастойны прадукт. Паглядзіце, наколькі ў наш час папулярныя аўдыякнігі — колькасць спампоўванняў вам выдасць любы інтэрнэт-сайт. Гэты фармат адпавядае павевам часу: слухаць можна падчас іншых спраў — велашпацыру, спартыўных трэніровак, працы па доме.

Сярод бацькоў карыстаюцца папулярнасцю вэб-старонкі з алічбаванымі савецкімі плыткамі ды сучаснымі аўдыяэнцыклапедыямі — яны становяцца лепшай заменай бясконцых мультпраглядаў. Дарэчы, у дзіцячых садках ды малодшых класах школы я таксама сутыкаюся з тым, што педагогі ўключаць аўдыягісторыі. Дык чаму беларускім радыёспектаклям не пацясніць тут канкурэнтаў? А ў беларускамоўнай нішы і ўвогуле вольнага месца зашмат.

Да слова, на тых жа расійскіх сайтах у адкрытым доступе багата матэрыялаў Беларускага радыё. Спадар Уладзімір ведае гэтую праблему: "Усё, што праходзіць у эфіры, транслюецца ў інтэрнэце. А праз інтэрнэт зрабіць запіс, каб выкласці на адмысловых сайтах, нескладана". Для мяне ж гэтая гісторыя — яшчэ адзін факт, які пацвярджае запатрабаванасць беларускіх аўдыёспектакляў.

Трэба ўмець прасоўваць сваё. Плыткі з запісамі, адмысловы сайт з айчынным кантэнтам, больш інфармацыі пра тыя спектаклі, што ўжо выйшлі на Першым нацыянальным канале (ПНК) і канале "Культура", — крокі ў гэтым напрамку зробяць айчынныя радыёпастаноўкі пазнавальнымі. Бо, паклаўшы руку на сэрца, ці многа хто са звычайнай аўдыторыі ведае пра мастацкія дасягненні радыёэфіру? І гэта пры тым, што радыёсігналы ПНК і "Культуры" амаль стопрацэнтова ахопліваюць краіну. Пры розгалассе прасцей будзе наладзіць дзяржаўна-прыватнае партнёрства — і тады запіс можна ладзіць пры фінансавай падтрымцы мецэнатаў. Праўда, гэтае маё пытанне ўжо не да Беларускага радыё, бо яно не мае права займацца стварэннем камерцыйнага прадукту — адно гуказапісам у сваіх студыях.

Пакуль жа арыгінальныя радыёспектаклі толькі пачынаюць намацваць сваё месца ў сучасным радыёэфіры. 1 — 2 пастаноўкі на год у сучасных умовах таксама шчасце, бо нават маленькія крокі робяць вялікую справу ў захоўванні назапашанай спадчыны. А там глядзі — пры спрыяльных умовах, добрай піяр-кампаніі ды талковым менеджменце канал "Культура" зможа адкрыць у сябе самавітую пляцоўку нацыянальнага радыётэатра.

К

КУЛЬТУРА WWW.KIMPRESS.BY № 33 / 18 ЖНІЎНЯ 2018 г.

Тайна літары “Ю”

Магілёўскі драматычны тэатр завяршыў сезон прэм’ерай. У два апошнія ліпеньскія вечары тут прайшоў спектакль з загадкавай назвай “Ю”.

Надзея БУНЦЭВІЧ

Аднайменную п’есу расійскага драматурга Вольгі Мухінай паставіў Міхаіл Лашыцкі, які ўжо амаль год працуе рэжысёрам гэтага тэатра. Спектакль, жанрава азначаны як “экзістэнцыяльная камедыя”, атрымаўся яркім, цікавым. І не толькі з-за выбару матэрыяла, а з прычыны ўдала знойдзенага ключа да яго сцэнічнага прачытання. Бо ў п’есе не адбываецца нічога асаблівага: героі вядуць гутаркі, часам не слухаючы адзін аднаго, п’юць каву-гарбату-віно, п’янеюць ад гарэлкі і кахання, танцуюць. Ідылія раз-пораз парушаецца стрэламі, раненнямі, спробамі самагубства — але быццам “ненасамрэч”, з заўсёдным камікаваннем. А ў фінале хлопцы сыходзяць на вайну. На якую — незразумела. Дый не важна. Бо яна — заўсёды побач.

Дарэчы, гэтая п’еса, напісаная ў 1996-м, у Беларусі прадстаўлена не ўпершыню. У 2014-м на Міжнародным тэатральным фестывалі “Белая Вежа” ў Брэсце мы бачылі “Ю” Невялікага драматычнага тэатра з Санкт-Пецярбурга ў пастаноўцы Льва Эрэнбурга. У тым спектаклі, адзначаным дыпломам “За лепшую рэжысуру”, п’еса служыла хіба адпраўным пунктам да далейшых развагаў “пра час і пра нас”: тэкст быў цалкам перапрацаваны, значна скарочаны, дзеянне — насычанае рэальнымі прыкметамі брэжнеўскага застою, чаго ў аўтара не было.

Магілёўская версія — прынцыпова іншая, максімальна набліжаная да драматургічнага арыгіналу. Міхаіл Лашыцкі, выступіўшы рэжысёрам і адначасова мастаком-пастаноўшчыкам, скіроўвае п’есу не ў бок постмадэрнісцкіх інтэрпрэтацый сацыялістычнага рэалізму, а да тэатра абсурду. У п’есе час дзеяння не вызначаны. У спектаклі — падкрэслены дэталі з розных часавых вымярэнняў, на паралелях паміж якімі і будуецца дзеянне. Светлыя строі Севы (Дзмітрый Дудкевіч), Барсукова (Уладзімір Пятровіч) нагадваюць 1930-ыя, адзенне Мікалая (Максім Чарнюк), Ані (Анжаліка Барчан) — сучаснае. Чырвоныя галыштук і падцяжкі Дзмітрыя (Чэслаў Вількін), блескучы чырвоны плашч экзальтаванай Піраговай (Марыя Рудакова) адсылаюць да 1990-х, а яе ж белыя шкарпэткі — да пасляваеннага часу. Андрэй у сваім класічным строі (Даніла Самкнулаў) успрымаецца “па-за часам”, з відавочнымі алюзіямі на “лішняга чалавека” рускай класікі XIX стагоддзя. Выведзены на сцэну і Лётчык Віця з заліхвацкі налепленымі вусамі (Аляксандр Палішчук), які ў п’есе толькі згадваўся.

Такое ж спалучэнне тэхнік і прыёмаў розных часоў назіраецца ў рэжысуры і сцэнаграфіі. Адсутнасць куліс, калі не занятыя ў той ці іншай сцэне артысты не сыходзяць, а знаходзяцца побач, хіба што не на першым плане, уласцівае яшчэ тэатру часоў Шэкспіра. Актыўнае выкарыстанне паваротнага кола, што ўпершыню з’явілася ў XVIII стагоддзі ў тэатры кабукі, — шматлікім класічным пастаноўкам мінулых дзясяцігоддзяў. Замена мэблевага атачэння некалькімі ўніфікаванымі крэсламі — спектаклям малой формы, тэатральнаму мінімалізму.

Тэкст п’есы захаваны амаль цалкам, агучаны нават рэмаркі. З любоўю падкрэслены чэхаўскія матывы ўсеагульнай захаханасці, ды без узаемнасці. Абапіраецца спектакль і на аўтарскія выявы, змешчаныя ў гэтай, паводле арыгіналу, “п’есе з малюнкамі”. Не, карцінкі з кніжкі не праектуюцца на экран. Але іх асноўная ідэя — супрацьпастаўленне “маленькага чалавека” і прашлага, грамадскага атачэння — рэалізуецца ў разнастайных дадатках. Так, гукавая палітра спектакля пашырана не толькі інструментальнай музыкай і песнямі (усё — “жыўцом”), але і фрагментамі “радыёперадач” — пра чатыры фізічныя станы рэчыва (чытай: псіхалагічныя станы чалавека) і шэсць прыярытэтных сфер, якія патрабуюць дзяржаўнага фінансавання.

Дададзеныя да п’есы фразы шмат у чым становяцца ідэйнай, сэнсавай квінтэсенцыяй спектакля. Акрэслліваюць згаданы тэматычны стрыжань: чалавек і грамадства, асоба і сусвет. Выклікаюць суцэльную повязь незапланаваных асацыяцый. Праз тыя дадаткі назва “Ю” ўспрымаецца не толькі як англамоўнае “ты, вы” ці працягны канчатак ад “люблю-ю-ю”, пра што пісалі ў свой час даследчыкі, аналізуючы п’есу. Візуальнае ўвасабленне літары чытаецца ў спектаклі яшчэ і як спалучэнне адзінкі і нуля. Ці палачкі, з дапамогай якой у калгасах ды турмах падлічвалі адпрацаваныя/адседжаныя дні, — і эліптычнай арбіты спадарожніка, які “баразніць касмічныя прасторы”.

На падобныя думкі настройвае і сцэнаграфія: хатні абажур, які звешваецца з каласнікоў, такі вялізны, што нагадвае парашут (на жаль, з ім цягам спектаклю так нічога і не адбываецца — вісіць сабе ды вісіць, бы маўклівы сведка часу). А парашуты, між іншым, былі намаляваныя на тытульным лісце п’есы! Там іх многа і ўсе яны маленечкія, знаходзяцца бы ў броўнаўскім руху — і перагукаюцца з дададзенымі ў спектакль “станамі рэчыва”.

З развіцця “маляваных” ідэй п’есы вынікаюць таксама афіша і дызайн вокладкі праграмкі (мастак па рэкламе — Святлана Піліпенка): вялізная літара складзеная з броўнаўскага руху маленечкіх “ю”, што збіліся ў зграю.

Артысты іграюць з задавальненнем, ствараюць запамінальныя вобразы. Некаторыя акцёры паўстаюць у новых, нечаканых для іх амплуа. Добра выкарыстоўваюцца самі тэмбры галасоў, розныя манеры маўлення, парадзіраванне ўзнёсла-захопленага тону. Даволі малады Аляксей Цыбін удала пераўвасабляецца ў 60-гадовага Сцяпана Іванавіча, канчаткова скараючы сваім сакавітым басам. Пачуццёвае кантральта Алены Крыванос дадае пікантнасці яе ролі Сястры. Адкрыта камедыйныя ноты ўзбагачаюць аблічча Лізаветы Сяргееўны (Яўгенія Белацаркоўская).

Дзве бабулькі, якія ў п’есе выступаюць своеасаблівым працягам шэкспіраўскіх вядзьмарак ці самога лёсу, зліваюцца ў спектаклі ў адну — гэтакую каларытна іранічную цётачку ў ватніку ды гумовых ботах, якая папраўдзе “дырыжыруе” дзеяннем. У тым ліку, у самым прамым сэнсе: кіруе фартэпіённым трыа “Экспромт-класіка”, якое існуе ў складзе тэатра і задзейнічана ў спектаклі (Ала Мурзіна — скрыпка, Надзея Мілаванава — віяланчэль, Людміла Барэйша — сінтэзатар). Тая ж дзіўная Бабулька (Галіна Угначова) чытае змешчаныя ў п’есе рэмаркі. А ў пачатку спектакля ўвогуле прадстаўляе ўсіх персанажаў — што, дарэчы, робіць даволі складаны тэкст п’есы зразумелым нават непадрыхтаванаму гледачу.

Спектакль пабудаваны на рэзкіх кантрастах дынамікі і тэмпарытму: цішыня змяняецца стрэламі, імклівае развіццё — прыпынкамі, бег — сядзеннем на крэслах тварамі да гледача. Праўда, пакуль моманты запаволення выглядаюць менш пераканаўча. У некаторых з іх, асабліва ў другой дзеі, так і хочацца хаця б крыху ўнутранага руху, бо любыя паўзы патрабуюць большага майстэрства, чым самыя напружаныя кульмінацыі.

З цягам часу спектакль, безумоўна, “разыграецца”. Артысты будуць яшчэ больш вольна пачуваць сябе ў новых іпастасях, іграць сабе ў задавальненне. Магчыма, некаторыя цяперашнія прасяданні ў развіцці дзеяння знікнуць ці хаця б зміксуюцца. Ну, а публіка, мяркуючы па аншлагу, спектакль упадабала.

Магілёўская версія “Ю” максімальна набліжаная да драматургічнага арыгіналу.



Цытаванні цягнуць на дно

Канец сезона Беларускі дзяржаўны акадэмічны музычны тэатр адзначыў некалькімі прэм’ерамі, і сярод іх — балет “Тытанік”. Ідэя належала дырэктару тэатра Аляксандру Пятровічу. Музыку стварыў вядомы кампазітар Алег Хадоска (у гэтым тэатры ідуць адразу некалькі яго спектакляў). Балетмайстрам-пастаноўшчыкам стаў Сяргей Мікель, дадаўшы гэты двухактовы балет да свайго леташняга “Вішнёвага саду” ў тым жа тэатры і харэаграфіі ў дзіцячым мюзікле “Лятучы карабель”.

Надзея БУНЦЭВІЧ

Узгадванне ранейшых прац творцаў — невыпадковае. Яно сведчыць, што пасля доўгіх і часам складаных пошукаў тэатр знайшоў, нарэшце, сваіх аўтараў. І гэта робіць калектыву гонар. Узрошчванне і далейшае прасоўванне айчынных мастакоў — пачэсная праца, карысная не толькі для саміх удзельнікаў гэтага працэсу, але і для развіцця ўсёй нацыянальнай культуры.

Якім жа атрымаўся новы спектакль? Мяркуючы па аншлагах на ўсіх трох прэм’ерных паказах, якія ішлі літаральна адзін за адным у спякотны дачны сезон, і па надзвычай бурных авацыях усе тры вечары запар, публіка — у экстазе. Дадам, што па інтэрнэт-апытанні наконт лепшага спектакля сезона, якое праводзіў на сваім сайце Музычны тэатр, балет выйшаў на другую пазіцыю з васьмі, саступіўшы толькі мюзіклу “Трыстан і Ізольда”.

Павінен падабацца “Тытанік” і самім удзельнікам. Замест абагульненай фармулёўкі: “у ролях экіпажа і пасажыраў — артысты балета”, тут кожны атрымаў сваю маленечкую ролю, пазначаную ў праграмцы. Праўда, такая колькасць дзейных асоб зусім не падтрымана іх персаніфікацыяй. Нават цэнтральную гераіню Маргарэт, якая ледзь не ў кожнай сцэне змяняе ўбранні, пазнаць можна найперш не па пластыцы, а па абліччы самой артысткі — Алены Германовіч.

Спектакль вабіць відовішчам, якое разгортваецца на экране з дапамогай відэапраекцый, у тым ліку метадам “наплываў”. Пабудаваны на сцэне мост з дзвюма лесвіцамі становіцца і верхняй палубай, і абагульненым вобразам карабля (мастак-пастаноўшчык — Любоў Сідзельнікава, мастак па камп’ютарнай графіцы — Алена Ахрэменка).

Моцным бокам з’яўляецца музыка. Спачатку гэту працу замовілі іншаму аўтару, але калі папярэдне аб’яўленую прэм’еру давялося перапрыкладу, знакамітай “Раніцы” з “Пер Гюнта” Грыга).

Дырыжорам-пастаноўшчыкам выступіла Марына Трацщякова. Мне давялося ўбачыць трэці спектакль — на чале з галоўным дырыжорам Юрыем Галясам. Аркестр выдатна спраўляўся з няпростай фактурай, не губляў ні каларытнай жанравасці, ні напружанага нерва.

У харэаграфіі таксама ёсць нешараговыя дэталі, якія можна было б акцэнтаваць ды развіваць надалей. Гэта “веер” з чатырох ног закаханых, што на імгненне ўзнікае ў Адажыа — і паўтараецца з двума дзівочымі нагамі ў фінале: хлопец загінуў. Сола, так бы мовіць, “ля станка” — на абмежаванай прасторы верхняга яруса, дзе ўсталяваны поручні. Ідэя запаволенага руху ног, калі завеса напалову апускаецца, пакідаючы толькі ніжнія часткі целаў патанулых. Кантраст танцаў высакароднай знаці і народных скокаў ніжэйшых саслоўяў.

Ды парасткі, з якіх можна было б вырошчваць цэльнае магутнае дрэва, не развіваюцца. Балет уяўляе сабой спалучэнне харэадрамы з устаўнымі канцэртнымі нумарамі, якія адлюстроўваюць танцы на караблі — сярод пасажыраў першага і трэцяга класаў. Але ж Сяргей Мікель здольны на большае! Так, гэта ўсяго толькі яго магістарская работа (“Вішнёвы сад” быў дыпломнай), ды заўжды хочацца больш імклівага развіцця таго творчага патэнцыялу, што быў відавочны ў ягонай колішняй мініяцюры “Знойдзеныя і страчаныя”, якая адкрыла імя маладога пастаноўшчыка шырокай грамадскасці.

Ды ўсё ж самым праблематычным у спектаклі застаецца момант захавання аўтарскіх правоў — пачынаючы з лібрэта, якое пераказвае аднайменную кінастужку, і заканчваючы многімі іншымі запазычанымі адтуль дэталямі. Дарэчы, стваральнікі спектакля маглі б лёгка абыйсціся без прамых зваротаў, зрабіўшы цалкам уласную версію. Бо кожны творца марыць пра арыгінальнасць сваёй канцэпцыі на ўсіх узроўнях. Дый сучаснае мастацтва прапаноўвае безліч варыянтаў больш правамерных “цытаванняў”. Абавязковасць “кінаперакладу” сыходзіла ад кіраўніцтва тэатра — і, дарэчы, не ўпершыню: маўляў, “раскручаныя” тэмы неабходны для прыцягнення публікі. Калі так, дык мэта дасягнута.

Пабудаваны на сцэне мост становіцца і верхняй палубай, і абагульненым вобразам карабля.

Аўдыя & Відэа

Алег КЛІМАЎ, спецыяльны карэспандэнт “К”

Кастусь КАЛЕСНІКАЎ, бас-гітарыст гуртоў “НагУаль” і The Silicon

Ліпеньскія аўдыя / відэаработы айчынных выканаўцаў рэцэнзуюць бас-гітарыст гуртоў “НагУаль” і The Silicon Кастусь КАЛЕСНІКАЎ (А.) і спецыяльны карэспандэнт газеты “Культура”, музычны крытык Алег КЛІМАЎ (В.).

АЎДЫЯ

Ганна Жданава, сінгл Znichka

А.: Ганна мне больш знаёмая па гуртавой творчасці, а тут яна выступіла як сольны выканаўца, заклікаўшы “на дапамогу” іншых музыкантаў. Стылістычна гэта ўсё — той жа модны электрапоп, а вось на беларускай Жданава заспявала ўпершыню. І праблемы выявіліся — некаторыя словы можна разабраць з цяжкасцю (пры запісе нешта напартачылі?). У цэлым жа, сінгл пакінуў вельмі светлае ўражанне — лёгкі, прыемны для слыху трэк.

В.: Акрамя трэка з вакалам самой спявачкі, у сінгл увайшлі яшчэ тры варыянты загалоўнай кампазіцыі ад трох беларускіх выканаўцаў, што выкарыстоўвалі і голас Жданавай. Гэта першы вопыт Ганны ў рэалізацыі беларускамоўнай песні, і спроба ўдалася. Прыгожая, пяшчотная эйсід-дарожка, якая і ў клубе зойдзе “на ўра”, калі дамы запросяць кавалераў на павольны танец, і ў хатніх умовах — замест калыханкі. Цікавы быў бы паўнафарматнік, вытрыманы ў тым жа духу.

Гурт Groove Dealers, мініі-альбом Minsk — California

А.: Эпіграфам для гэтага рэлізу я абраў бы фразу “Танцуй пакуль малады”. Юнацкага запалу тут сапраўды хапае: кананічнаму фанку хлопцы надалі акцэнтаванай танцавальнасці. Сыграна і праспявана ўсё на ўзроўні: чуваць, што музыканты ўмеюць складаць мелодыі. Стыль у гурта, безумоўна, ёсць. Ведаю, што людзі на канцэрты ходзяць. З пажаданняў — калі команда марыць аб большай папулярнасці, ёй патрабуюцца хіты. А падмурак для іх ёсць.

В.: Рэдкая для нашых зямель музыка: мінскі гурт працуе ў ragga-фанк-стылістыцы, і ўвесь гэты кактэйль добранька перамяшаны, так што танцпол застанецца задаволены (ва ўсякім выпадку, пад трэк “Бум-бяжы” выстаяць не ўдасца). Якая ў каманды будучыня? Цьмяна яе бачу. Вось у выглядзе такога сэта з чатырох песень (столькі кампазіцый на гэтым міні-альбоме) у клубе калектыў будзе цалкам дарэчны, як і ў зборным канцэрце — сярод сабе падобных ансамбляў. Для большай жа папулярнасці — і, як вынік, камерцыйных перспектыў — патрэбны забойныя хіты. І ў дадзеным жанры ў свеце такіх хапае. Ці хопіць таленту ў музыкантаў Groove Dealers стварыць нешта абсалютна шлягернае? Час пакажа.

Murovei, альбом “Змрочны сезон”

А.: Спачатку насцярожвалі доўгія медытатыўныя, дзесьці наогул псіхадэлічныя інструментальныя ўступленні — чакаў я звычайнага рэпу. Але да кампазіцыі трэцяй — чацвёртай наладзіўся і на такі яго “варыянт”. Нават захапіла. У гэтым і характэр альбома (вечарам ён проста выдатна зойдзе): перад слухачамі і класічны хіп-хоп, і адчуваецца, што над аранжыроўкамі ды іх разнастайнасцю папрацавалі вельмі старанна. Мяркую, што гэты артыст упэўнена трымаецца ў рэп-тусоўцы. Сваё аблічча ў яго ёсць.

В.: Не ўпэўнены, што альбом аднаго з лідараў айчыннай хіп-хоп-культуры прыйшоўся б па душы бабулям якой-небудзь з беларускіх вёсак, калі б ён па прыкладзе свайго “бро” — Макса Коржа, адважыўся б несці творчасць у самы што ні на ёсць народ. Усё ж такі, гэтае музычнае мастацтва занадта ўтылітарнае (таму, мабыць, і пра сельскіх рэпераў, якія падрываюць асновы стылю, пакуль не чуваць). Гэта гарадскія рэчытатывы пра адпаведныя актуальныя гісторыі, якія назірае і каментуе выканаўца. І ў такой якасці дадзены рэліз жанру адпавядае. Спадабалася, што ў ім няма падлашчванняў з “пацанствам”, чым усё больш і больш грашыць той жа Корж. Гэта словы пасталелага маладога чалавека, які не смяецца з усяго навокал, не адмаўляе ўсё і ўся, а задумваецца, разважае. Гэта сапраўды альбом аднаго з цяперашніх беларускіх хіп-хоп-флагманаў.

ВІДЭА

Гурт “Дрозды”, Анатоль Ярмоленка, Ксенія Леўчык, кліп на песню “Гэта любоў”

А.: Карцінка выйшла настолькі рэкламнай, што да канца ўжо хочацца заплюшчыць вочы, каб не бачыць, як табе навязваюць пэўную марку марожанага. Адпаведна, і вушы закрыць цягне. Можна было б зрабіць ролік менш агрэсіўным у гэтым сэнсе, ды і некаторыя сюжэтныя ходы мне здаліся залішне смелымі, ці што. А так — фірмовая кампазіцыя ад Карпанава і Ка.

В.: “Трылер” з пагоняй пачынаецца акурат па мінскага Цэнтральнага дзіцячага парку імя Горкага, калі ў прадаўца марожанага (у яго ролі зняўся лідар “драздоў” Віталь Карпанаў) аніматар-веласіпедыст у касцюме лася крадзе скрыню прысмакаў. Забег заканчваецца тым, што выкрадальнік не спраўляецца з кіраваннем двухколавым сябрам і звальваецца ў Свіслач. І вось ён ужо на лавачцы на беразе, а пад маскай жывёлы, аказваецца, хаваўся Анатоль Ярмоленка! Здзіўлены Карпанаў пытае яго: “Анатоль Іванавіч, што гэта было?” “Ну, хайпануў трошкі. А што рабіць?” — адказвае народны артыст Беларусі. А ў парку на адкрытай пляцоўцы грае ансамбль “Дрозды” з тым самым Карпанавым і юнай спявачкай Ксеніяй Леўчык. Прыгажосць, ідылія. І песня такая ж светлая — аб вечных чалавечых каштоўнасцях: любові, дабрыні, удзеле, клопаце, увазе. І марозіве.

Другі Спас спелых яблык прыпас

Сярэдзіна лета — самая пара ласавацца мёдам і яблыкамі. А таксама ладзіць "мядовыя спаборніцтвы", конкурсы ды фестывалі з нагоды Мядовага Спаса, які адзначаецца 14 жніўня.

Юрый ЧАРНЯКЕВІЧ

Менавіта так і зрабілі ў аграгарадку **Усялюб**, што на **Навагрудчыне**. Як паведаміла "К" дырэктар Навагрудскага раённага цэнтра культуры і народнай творчасці Наталля Кавальская, падчас свята "Мядовы вальс" жыхары паселішча змаглі не толькі прадэгуставаць мёд ад найлепшых пчалаводаў краю, але і паўдзельнічаць у вясёлых "мядовых" конкурсах, папіць мядовы квас і гарбату, а таксама паназіраць за выступленнямі мясцовых артыстаў. *"Без пачастунку і прыемных сюрпрызаў ніхто не пакідаў святочнай пляцоўкі"*, — напісала нам аўтар ліста.

Адметны "Мядовы фэст" зладзілі 12 жніўня і работнікі культуры аграгарадка **Цырын**. Па словах супрацоўнікаў аддзела метадычнай работы **Карэліцкага** РЦКіНТ, гэтае брэндавае мерапрыемства праходзіць у Цырыне другі год і з кожным разам набывае ўсё большую папулярнасць. *"На фестывалі была арганізавана выстава-продаж мёду, дзе кожны ахвотны мог найперш пасмакаваць, а потым і набыць сабе баначку-другую"*, — пішуць аўтары ліста. Таксама працавала і алея майстроў, дзе на продаж былі выстаўлены разнастайныя вырабы народнага і сучаснага мастацтва.

Свой мядовы фестываль зладзілі і ў аграгарадку **Граўжышкі**, што на **Ашмяншчыне**. Па словах аўтаркі ліста Аліны Санюк, падчас свята можна было пакаштаваць розныя гатункі мёду, пабавіць час на дыскатэцы, а таксама паглядзець канцэртную праграму, падрыхтаваную як мясцовымі артыстамі, так і гасцямі з Ашмян і навакольных паселішчаў.

Таксама свята з нагоды Спаса прайшло ў доме культуры **Крэва**. 12 жніўня работнікі ўстановы культуры запрасілі аднавяскоўцаў на канцэртна-забаўляльную праграму "Другі Спас спелых яблык прыпас", — паведаміла нам дырэктар **Смаргонскага** цэнтра культуры Галіна Крацянок. Гледачы ўдзельнічалі ў віктарынах, жартоўных конкурсах, вадзілі карагоды, загадвалі жаданні, успаміналі прыказкі і прымаўкі пра Яблычны Спас, гулялі ў "яблычныя" гульні, а таксама з задавальненнем пакаштавалі спелых яблыкаў.

На здымках:
1. Адкрыццё памятнага знака ў Новых Саматэвічах.
2. Пачастункі для ўдзельнікаў фэсту ў Дубна.
3. Цырын вітае гасцей "Мядовага фэсту"
4. Падчас літаратурнага марафону ў Навагрудку.
3. Пляценне вянкоў з каліны на свяце ў Тарнова.

Але гэта яшчэ не ўсе навіны са Смаргоншчыны. Днямі ў раёне прайшло свята, арганізаванае супрацоўнікамі і аматарамі мастацкай самадзейнасці **Кушлянскага** СК. Каб свята ўдалося, пастараліся не толькі загадчыца клуба Алена Вішнеўская і яе памочнік Улад Ясевіч, — да імпрэзы, па словах Галіны Крацянок, рыхтаваліся ўсе вяскоўцы. Такі характар талакі адчуваўся і ў аграгарадку **Солы**, дзе 12 жніўня ў мясцовым СДК была прэзентавана канцэртная праграма "Вянок беларускай песні".

І яшчэ адно паведамленне ад нашай няўрымслівай і сталай аўтаркі Галіны Крацянок. Яна піша, што нядаўна ў аддзеле традыцыйнай культуры **Смаргонскага** раённага Дома рамёстваў прайшоў майстар-клас па вырабе ўпрыгожанняў са скуры. *"Удзел у майстар-класе ўзялі людзі сталага ўзросту, для якіх усё новае заўсёды цікава, а заняткі правялі Ларыса Багданава, Раіса Лявонава і Таццяна Путырская"*, — піша аўтар. На выставе было прадстаўлена больш за 30 вырабаў: пано, ваза з кветкамі, сумкі, кашалькі і розныя ўпрыгожванні, а самі майстрыхі распавялі пра адметнасці сваёй працы са скурай і пазнаёмілі з адмысловымі інструментамі і ўнікальнай тэхнікай сваёй работы.

Яшчэ адзін брэндавы фестываль прайшоў днямі ў **Мастоўскім раёне** Гродзенскай вобласці. Як паведамляе загадчыца сектара культуры мясцовага райвыканкама Настасся Палуйчык, свята "Малочныя рэкі — хлебныя берагі" адбылося ўжо другі год запар у аграгарадку **Дубна**. Людзі ўсіх узростаў змаглі знайсці сабе занятак па душы, а таксама пакаштаваць свежую выпечку мясцовых гаспадынь. Як піша аўтар, *"нават "жарты" нябеснай канцылярыі не змаглі перашкодзіць святу"*.

А ў **Жалудку** адбыўся днямі фестываль кветак — пад дэвізам "Мы хацелі б уславіць радзіму". Як адзначае вядучы метадыст **Шчучынскага** РЦКіНТ Наталля Гардзейчык, на свяце былі прадстаўлены кветкавыя кампазіцыі арганізацый і прадпрыемстваў раёна, прайшлі конкурсы на лепшыя капялюшыкі і касцюмы. Таксама былі падведзены вынікі конкурсаў на лепшы ландшафтны дызайн, самыя прыгожыя сядзібы і кветнікі.

Яшчэ адзін ліст, які патрапіў у рэдакцыю з **Навагрудка**, распавёў пра літаратурны марафон "Чытаем "Новую зямлю". Дзея прайшла 13 жніўня — у дзень смерці народнага паэта Беларусі. А зладзіла мерапрыемства **Навагрудская раённая бібліятэка**. Па словах галоўнага бібліёграфа ўстановы Святланы Чубрык, падчас марафону прагучалі добра вядомыя радкі з вершаў паэта ў выкананні бібліятэкараў.

На **Лідчыне** днямі таксама адбылася адметная імпрэза — народнае гулянне "У каліны — імяніны" ў аграгарадку **Тарнова**. Па словах супрацоўнікаў Лідскага РЦКіНТ, славяне здаўна прыкмецілі, што да 11 жніўня каліна робіцца сапраўды спелай. *"Так было і на свяце ў Тарнова: гучалі песні пра каліну ў выкананні вакальнай групы "Славянскі сувенір", гледачы ладзілі карагоды каля прыгажуні-каліны, дзяўчаты ўпрыгожвалі пунсовымі каралямі імянінніцу каліну і плялі з яе вянкі"*, — пішуць аўтары ліста. На свяце можна было пакаштаваць пірагі з каліны (іх называюць "калінікі"), паўзірацца ў работы

майстрыхі-рукадзельніцы Аліны Магільніцкай, паўдзельнічаць у шматлікіх конкурсах і гульнях, а таксама пагартаць кніжныя выданні на выставе, якую падрыхтавала бібліятэкар Тарноўскай сельскай "кніжніцы" Таццяна Ашмяна.

У яшчэ адным лісце з **Ашмянскага** раёна "К" паведамілі пра тое, што на базе адпачынку ў **Вячкойнях** адбыўся open-air "Захад сонца". Як піша Інга Гіз, на свяце выступілі народны тэатр "Імпульс", народны ансамбль цыганскай песні "Джана Рома", кавер-бэнд Pobin Good і іншыя выканаўцы.

А завяршым нашу падборку лістоў паведамленнем на гэты раз не з Гродзенскай, а з Магілёўскай вобласці — з аграгарадка **Новыя Саматэвічы.** Яшчэ 4 жніўня там адбылося народнае гулянне "Ільінскі кірмаш", а таксама адкрыццё памятнага знака вёскам Касцюковіцкага раёна, выселеным пасля Чарнобыльскай катастрофы. Як піша намеснік дырэктара цэнтралізаванай клубнай сістэмы **Касцюковіцкага** раёна Наталля Дробышава, ініцыятарам устаноўкі помніка выступіў мясцовы ўраджэнец Аляксандр Сцепаненка, а грошы на праект і пабудову збіралі ўсе разам. Пазней распачаўся і сам фестываль. *"Мясцовыя жыхары не расходзіліся да апошняга акорда тэатралізаванай канцэртнай праграмы, што падрыхтавалі ўдзельнікі мастацкай самадзейнасці Новасаматэвіцкага клуба вольнага часу"*, — піша аўтар ліста і выказвае спадзяванне, што ў наступным годзе Ільінскі кірмаш пройдзе з яшчэ большым размахам. Спадзяёмся, менавіта так яно і будзе.

К

Заняткі харэаграфіі, ганчарства і… каратэ з тайскім боксам. Старое і новае, традыцыйнае і сучаснае, праверанае гадамі і рызыкоўна-эпатажнае. Не так даўно адкрыты Мінскі гарадскі палац культуры актыўна спрабуе знайсці ўласнае "месца пад сонцам" і не цураецца ладзіць у сваіх сценах і спартыўныя спаборніцтвы, і тэатральныя пастаноўкі, а ля ганку — танцавальныя фестывалі, у якіх можа прыняць удзел любы ахвотны. "К" прайшлася па абноўленых залах і кабінетах колішняга "Камволя" і пацікавілася, чым сёння жыве і "дыхае" Мінскі ГПК.

Юрый ЧАРНЯКЕВІЧ

ПЕРЫПЕТЫІ РАМОНТНАЙ ЭПАПЕІ

Сваім новым абліччам гэты палац ганарыцца, дарэчы, не так ужо і даўно — толькі з мая. А да гэтага была шматпакутная і шматгадовая "эпапея" па рамонце і рэканструкцыі былой установы культуры камвольнага камбіната, год "нараджэння" якой — 1965-ы.

— У 2006 годзе будынак камвольнага камбіната быў перададзены ў гарадскую ўласнасць, — кажа дырэктар Мінскага ГПК Мікалай Казюлін. — Парадаксальна, але факт: пры неверагоднай колькасці ўстаноў культуры, свайго гарадскога Палаца ў сталіцы не было. Рамонт ішоў цягам наступных дзесяці гадоў: калі было фінансаванне — будоўля ажывала, заканчваліся грошы — працы прыпыняліся. Я за гэты час паспеў стаць самым сапраўдным будаўніком, а не проста кіраўніком установы культуры.

Тая рамонтна-будаўнічая "эпапея" працягвалася ажно да вясны 2017 года, калі гарадскія ўлады рэканструкцыяй заняліся сур'ёзна. І нарэшце сёлета ўстанова культуры ўрачыста адчыніла свае дзверы для наведвальнікаў. Кардынальна памяняўшы пры гэтым не толькі ўнутранае ды знешняе "аблічча", але і сваю назву.

— Спачатку мы называліся даволі проста, можна сказаць, "па-мясцоваму": "Палац культуры "Лошыцкі", — кажа Мікалай Казюлін. — Але з-за гэтага часта ўзнікалі непаразуменні: нехта блытаў нас з СДК уяўнай вёскі Лошыца, а нехта — нават з Лошыцкім паркам. Карацей, бывала ўсякае — і смешнае, і горкае. Таму пасля рэканструкцыі вырашылі сваю ўстанову перайменаваць. Пагадзіцеся, цяпер, пасля ўлазін, мы такую ганаровую, на мой погляд, назву цалкам заслугоўваем!

Як сталічнаму Палацу культуры знайсці сваё месца пад сонцам?

Флэшмобы на асфальце

Унутранае і знешняе ўбранне Мінскага ГПК.

НАЧЫНКА МАТЭРЫЯЛЬНАЯ...

Словы дырэктара пра заслужаны статус Палаца цалкам пацвярджаюцца на практыцы — асабліва калі прайсціся з невялікай экскурсіяй па абноўленай установе культуры. Уражанне ад стыльнай раскошы, урачыстасці і велічы ўзнікае літаральна на ўваходзе ў Мінскі ГПК, калі ты трапляеш у вялікі хол з беласнежнымі калонамі і мармуровай падлогай, над якой узвышаюцца арыгінальныя прадаўгаватыя свяцільні — дарэчы, беларускай вытворчасці.

Шыкоўна глядзіцца і вялікая глядзельная зала Палаца, разлічаная больш чым на 600 месцаў. На падлозе — паркет, на сценах — адмысловыя панэлі ў пастэльных бела-бэзавых колерах, якія прызначаны ўзмацняць гук, што ідзе са сцэны. Удачай Мікалай Казюлін лічыць і захаванне паваротнага круга на сцэне, што дае магчымасць ставіць тэатральныя п'есы, у якіх падзеі спектакля за некалькі хвілін пераносяцца з адной эпохі ў іншую.

На другім паверсе месціцца малая зала, разлічаная амаль на 200 месцаў, якую выкарыстоўваюць як для тэатральных пастановак і канцэртаў, так і ў якасці канферэнц-залы. Светлыя і прасторныя харэаграфічныя залы, асобная зала для рэпетыцый аркестра, шмат памяшканняў для размяшчэння грымёрных і розных гурткоў. Карацей кажучы, творчым людзям у падобнай установе працаваць утульна. Вось такія б палацы, думалася мне падчас праходкі па светлых пераходах Мінскага ГПК, — і ва ўсе нашы раённыя цэнтры! Можа, калі-небудзь так і будзе?

Каб завяршыць размову пра агульнае ўражанне ад аблічча Палаца культуры, скажу яшчэ і пра тое, што ва ўстанове сёння выкарыстоўваецца самая найноўшая сучасная тэхніка. Скажам, тут стаіць светлавое абсталяванне ProLights і Avolites (Італія), гукавое абсталяванне кампаній MAG Audio (Украіна), Proel (Італія) і Roland (Японія), праекцыйнае абсталяванне Barco (Бельгія), матарызаваныя экраны Mechanische Weberei (Чэхія), а таксама камплектуючыя ад кампаніі Beglec (Бельгія). Такі "замежны" (і заможны!) абноўлены парк прафесійнага абсталявання, па словах кіраўніка ўстановы, дазваляе сёння Мінскаму ГПК ладзіць мерапрыемствы любога ўзроўню. У чым, па праўдзе кажучы, у мяне сумненняў і не ўзнікала.

...І НАЧЫНКА ТВОРЧАЯ

А не ўзнікала таму, што творчы складнік установы таксама пакінуў станоўчыя ўражанні. Тут дзейнічае 14 творчых калектываў, з іх шэсць маюць званне "народны" і "ўзорны", шматлікія гурткі па інтарэсах, клубныя фарміраванні. Пералічваць іх усе, думаецца, не варта. Заўважу толькі, што, па словах Мікалая Казюліна, сёння ў народную дзіцячую скульптурна-керамічную студыю ходзяць столькі аматараў лепкі і працы на ганчарных кругах, як ніколі дагэтуль.

Але асноўны ўхіл у сваім творчым і крэатыўным развіцці ва ўстанове культуры зрабілі на палітыку дзяржаўна-прыватнага партнёрства.

— Сёння ў нас распрацаваны спецыяльны праект такога супрацоўніцтва, у які ўваходзяць ажно 34 розныя калектывы, — кажа дырэктар Мінскага ГПК. — Гэта, напрыклад, студыя сучаснага танцу "Тандэм", Мінскі спартыўны клуб ушу, Мінскі госпел-хор. Праз супрацоўніцтва з гэтымі калектывамі мы імкнёмся не толькі ладзіць знакавыя культурныя мерапрыемствы, але і зарабляць неблагія грошы.

Як мяркуе Мікалай Казюлін, айчынная сфера культуры ва ўмовах адкрытай эканомікі можа працаваць на самаакупнасці, а не быць датацыйнай. І гэта пацвярджаецца практыкай. Напрыклад, сёння ў сценах установы ладзяцца прыватныя тэатральныя пастаноўкі (дзве з іх пройдуць літаральна днямі), распачалася дзейнасць клубаў гістарычнай рэканструкцыі, ствараюцца творчыя майстэрні, якія папулярызуюць беларускія народныя строі. Усё гэта, зразумела, на аплатнай і дагаворнай аснове.

Асобная тэма — дзіцячыя ранішнікі. Адна з прыватных фірмаў ужо падпісала з дырэкцыяй дамову пра тое, што зладзіць у сценах Мінскага ГПК ажно 40 навагодніх і калядных спектакляў — з 21 снежня па 7 студзеня. Так што ў некаторыя дні іх будзе праходзіць ажно некалькі — для дзяцей любых узростаў.

— Дык вось, паводле дамовы, 35 працэнтаў даходу ад продажы білетаў пойдуць на рахунак нашай установы культуры, 65 працэнтаў — прыватніку, — кажа Мікалай Казюлін. — Прычым мы прадастаўляем толькі памяшканне. Усё астатняе — артысты, дэкарацыі, неабходнае тэхнічнае абсталяванне, іншыя арганізацыйныя моманты — бярэ на сябе прыватнік. Думаю, гэта адзін з тых прыкладаў дзяржаўна-прыватнага партнёрства, карысць ад якога — для абодвух бакоў. Па падобнай схеме працуем і з іншымі нашымі партнёрамі.

Цікава, што сярод партнёраў установы культуры шмат спартыўных арганізацый. Напрыклад, дзятва ў Палацы можа пазаймацца каратэ, таэквандо, спартыўным ушу, тайскім боксам, кікбоксінгам, тайцзыцюань (гэта адзін з найбольш адметных відаў кітайскіх адзінаборстваў) і нават спачанам (націск на другім а) — японскім фехтаваннем на бяспечных мячах.

— Мая прынцыповая пазіцыя ў тым, каб у нашым Палацы заўсёды было месца для дзетак, якія хочуць падтрымліваць здаровы лад жыцця, — кажа Мікалай Казюлін. — Да таго ж, усе гэтыя арганізацыя таксама працуюць у нас на дагаворных умовах і прыносяць сякую-такую "капейчыну" ў план платных паслуг. Так што мы ў кожным разе застаёмся ў выйгрышы!

Дарэчы, сёння, 18 жніўня, каля Мінскага ГПК, пройдзе дзень аргентынскага танга, падчас якога можна будзе не толькі ўбачыць шматлікіх артыстаў, якія прадэманструюць публіцы ўсе выкшталцоныя піруэты гэтага паўднёваамерыканскага класічнага танца, але і самім паспрабаваць сябе ў ролі танцораў. Па словах Мікалая Казюліна, яны штосуботы ладзяць танцавальныя флэшмобы, а з верасня ў Палацы пачнуць праходзіць танцавальныя вечары для тых, каму за...

Заняткі Мінскага госпел хору пачынаюцца з размінкі.

Карацей кажучы, Мінскі ГПК сёння працуе з усімі зацікаўленымі арганізацыямі і наведвальнікамі — хоць малога, хоць маладога, хоць старога веку. Што ж, як кажуць, высокі статус да гэтага проста абавязвае.

ГОСПЕЛ У СЦЕНАХ ПАЛАЦА

І апошняе, пра што хацелася б расказаць. У хуткім часе — ужо з верасня — у сценах Палаца будзе працаваць Multicolor Gospel Choir — падраздзяленне Мінскага госпел-хору.

Сам хор існуе ў сталіцы ўжо больш за 5 гадоў, і як кажа адзін з яго арганізатараў Павел Шведаў, яго на сёння наведвае блізу 80 чалавек. Галоўнае адрозненне ад звычайнага хору — песні тут спяваюць не па нотах, а на слых. Немалаважна і тое, што сюды прымаюць любога, хто хоча спяваць, хай сабе ён (ці яна) не мае музычнае адукацыі і мінімальных навыкаў.

— Мы ставім навічкоў побач са сталымі ўдзельнікамі, і з цягам часу, пад кіраўніцтвам прафесійнага кіраўніка, яны паступова пачынаюць трапляць у рытм, адчуваць музыку і больш-менш нармальна спяваць, — кажа Павел Шведаў. — Мушу адзначыць, за тыя гады, што я ўдзельнічаю ў хоры, мне ні аднаго разу не сустрэўся чалавек, які абсалютна не здатны патрапіць у ноты. Таму галоўнае — гэта да нас прыйсці, а спяваць мы абавязкова навучым.

Але важныя, па словах суразмоўцы, у хоры не толькі спевы, а і тое, што ён дае магчымасць розным людзям пазнаёміцца паміж сабой, пасябраваць, завязаць кантакты ды пазбавіцца адзіноты.

— Таму і наша праца ў Мінскім ГПК, лічу, будзе карыснай як для ўстановы культуры ў Лошыцы, так і для нас, — кажа Павел Шведаў. — Мы зможам такім чынам развіваць сваю арганізацыю, прыцягваць у яе новых членаў, а Палац культуры займее яшчэ адну "разыначку": там будзе працаваць гурток, накіраваны не толькі на развіццё спеўнага майстэрства, а і на сяброўства. Карысць ад гэтага супрацоўніцтва — навідавоку.

Дадам, што Мінскі госпел-хор ужо 5 гадоў ладзіць міжнародныя фестывалі спеваў, на якія прыязджаюць шматлікія ўдзельнікі з іншых краін свету. Тэматыка песень розная: рэлігійная, эстрадная, джазавая. На фэсце можна пачуць песні Майкла Джэксана, Уінтні Хьюстан, Рэя Чарльза і многіх іншых вядомых выканаўцаў. І не толькі пачуць, але і самім паспрабаваць праспяваць вядомыя госпел-хіты. Прычым не толькі ў Мінску, але і далёка за яе межамі, бо, па словах Паўла, яны часцяком выбіраюцца за мяжу для ўдзелу ў госпел-фестывалях. Напрыклад, у бліжэйшы час 40 чалавек — амаль палова хору — накіруюцца ў Германію.

■■■

Пошукі свайго месца пад сонцам для любой установы культуры Беларусі сёння маюць шмат падводных "камянёў": дзеці, падлеткі, дарослыя "згубіліся" ў сваіх смартфонах. І калі сельская ці раённая ўстанова культуры можа прывабіць падлетка за кошт адметных мясцовых брэндаў, дык у сталіцы такія брэнды трэба ствараць самім або супрацоўнічаць з тымі, у каго яны ўжо ёсць. Чым, на мой погляд, сёння актыўна і займаецца Мінскі ГПК. Першыя крокі ў гэтым кірунку ўжо зроблены, і крокі, як бачна, даволі паспяховыя. А што ў выніку атрымаецца — пакажа яго Вялікасць час.

К

Ілья СВІРЫН

Заапарк для чалавека

Рыжская біенале сучаснага мастацтва стала неспадзяванкай нават для самаго гэтага горада, і без таго насычанага рознымі культурнымі падзеямі. І не толькі з той прычыны, што заяўка на статус еўрапейскага маштабу арт-цэнтра выглядае даволі пераканаўчай: 8 немалых па сваіх памерах лакацый, болей за сотню мастакоў з усяго свету. Сам сюжэт з'яўлення — бы Піліп з канапель — гэтай ініцыятывы можа падацца нам абсалютна неверагодным. Прынамсі, пакуль што.

Фота Паўла ВАЙНІЦКАГА



БАЛОТА ПАМЯЦІ

Кораткa сюжэт выглядае так. Дачка расійскага мультымільянера Агнія Міргародская, якая атрымала мастацкую адукацыю ў ЗША, наймае міжнародную каманду (куратарка Кацярына Грэгас родам з Грэцыі, хаця жыве ў Бельгіі, а, прыкладам, піярам займаліся два вядомыя брытанскія агенцтвы), каб тая зрабіла міжнародную выставу для міжнароднай жа публікі. Балазе, турыстаў у Рызе не бракуе, а многія едуць на біенале мэтава.

Сама сталіца Латвіі ў дадзеным выпадку апынулася найперш пляцоўкай, месцам дзеяння, зручным паводле розных параметраў пунктам зборкі. Але не толькі ў фізічным, а яшчэ і ў ментальным або сімвалічным сэнсе. Рыга здавён з'яўляецца мультыкультурным казаном (прычым не плавільным), у якім "варацца" прадстаўнікі самых розных народаў. Такой яна і застаецца. Нават неверагодна пярэстая гарадская архітэктура — гэта палімпсест слядоў самых розных эпох і культур.

Зважаючы на вышэйсказанае, праблем з бюджэтам біенале не мела — прычым сама Латвія не выдаткавала на яе ні еўрацэнта. Горад быў шчодра завешаны размаітай рэкламай з дураслівымі англамоўнымі слоганамі кшталту "Юцюбныя коцікі або мастацкія выставы?" (Шчыра кажучы, гумар англійскіх піяршчыкаў падаўся мне надта англійскім.) Мастакі атрымалі ганарары.

А вось выставачныя лакацыі выбіраліся зусім не "каб было па-багатаму". Яно і нядзіўна: мармур і крышталь сёння не ў модзе. У модзе — закінутыя заводы і будынкі з гісторыяй. І ў плане апрапрыяцыі такіх прастораў біенале прадэманстравала выдатны ўрок.

Цэнтральнай пляцоўкай быў абраны будынак біялагічнага факультэта, заснаванага яшчэ напрыканцы XIX стагоддзя. Сам факультэт нядаўна пераехаў, але перавесці ўсю сваю маёмасць не паспеў. Інтэр'еры засталіся некранутымі, і атрыманы ў выніку сайт-спецыфік праект стаў выдатным прыкладам папулярнага сёння панняцця "інтэрвенцыя" — калі мастацкі твор змяшчаецца ва ўжо "гатовую" прастору, выкарыстоўваючы яе адметнасці і надаючы ім новы сэнс.

Галандскі мастак Эрык Касэлс са сваім "Чалавечым заапаркам" уварваўся ў заалагічны музей. Размешчаныя там чучалы розных экзатычных і не вельмі звяроў ненавязліва дапоўнілі палароідна-фэйсбучнага кшталту фота двухногіх — як быццам, так яно было задумана ад пачатку. Праект падштурхоўвае да думкі, што кожнага з нас таксама могуць разглядаць у якасці цікавых экспанатаў, успрымаючы не як асобаў, а як "прадстаўнікоў віду". А егіпецкі аўтар Набіль Бутрас у якасці своеасаблівай антытэзы зняў партрэты авечак так, нібыта гэтыя фотасесіі яму замаўлялі самі жывёлы — з падкрэсліваннем індывідуальных рысаў кожнай з іх.

Шпацыруючы па факультэцкім парку, можна выпадкова наткнуцца на абгарожаны вещцем павільён. Інсталяцыя "Гняздо" латвійскай мастачкі Катрыны Нейбурга — гэта штучная экасістэма, створаная чалавекам з падручных матэрыялаў. Паволі прасоўваючыся па перакінутых праз балота жардзінках, ты нібыта трапляеш унутр чужой памяці. Угразнуць у гэтай дрыгве боязна, таму рухаешся асцярожна. Тым болей, у яе нетрах — быццам у народных паданнях — раптам праглядаюцца праявы іншасвету: пад вадою размешчаны відэаманіторы.

Вядомы амерыканскі мастак Марк Дыён прапануе тэзу "музей як выкапень". Гледачы бяруць ліхтарыкі ды выпраўляюцца даследаваць закінутую музейную прастору, літаральна набрынялую "пылам гісторыі". Зразумела, іх увагу прыцягваюць тыя экспанаты, якія найбольш эфектна свецяцца ў цемры — хаця кожны разумее, што гэтыя косці з'яўляюцца "фэйкавымі". Завіслы статус будынка, які раней быў цэнтрам навукі, аўтар выкарыстоўвае, каб выказаць скепсіс адносна вечнасці нашых ведаў — як выяўляецца, яны могуць застарвацца. І, да ўсяго, не такія ўжо і трывалыя.

Грэк Нікас Наўрыдзіс імкнецца працягнуць жыццё спісаным з факультэцкай бібліятэкі кнігам. Праўда, яго рэканструкцыя закінутай за непатрэбнасцю чытальні выглядае спецыфічнай: кнігі на стэлажах павернутыя да публікі не карэньчыкамі, а старонкамі.

БЯЗВЫЙГРЫШНАЯ ЛАТЭРЭЯ

Агулам, больш-менш удумлівае наведванне ўсіх біенальных лакацый зойме мінімум пару сутак — з перапынкамі на ежу і сон. Балазе, для ўдумлівасці ёсць усе ўмовы: шмастаронкавы каталог са зручнай навігацыяй змяшчае эксплікацыю да кожнага твора, дзякуючы чаму аўтарскія інтэнцыі не застаюцца незразуметымі — як гэта, зазвычай, на жаль, бывае ў выпадку з нашымі выставамі contemporary art.

Столькі часу ў мяне не было, і паглядзець, што дзеілася на старой баржы ў порце, на чыгуначнай станцыі ў Юрмале і на закінутай фабрыцы "Бальшавічка", я банальна не паспеў. Затое, патрапіў у два рыжскія лофты, якія нагадваюць нашу Кастрычніцкую.

Экспазіцыя ў былой коркавай фабрыцы, пераўтворанай у прыватны цэнтр сучаснага мастацтва Zuzeum, прапануе парафлексаваць над тэмпамі засваення інфармацыі ў сучасным грамадстве. Галандзец Хан Хольгербруге ўвасабляе той калейдаскоп вобразаў, матывацый, ілюзій, што несупынна круціцца ў нашай свядомасці з дапамогай латэрэйнага барабана. Лішне казаць, што латэрэя бязвыгрышная.

Варта адзначыць, што бадай абавязковай умовай для трапляння на біенале стала адпаведнасць нейкай планетарнага (ці прынамсі рэгіянальнага) маштабу тэматыцы — хай сабе, і трохі прыцягнутая за вушы. На жаль, крытэрый мастацкай выразнасці работы, вастрыні і вынаходлівасці аўтарскай думкі ўлічваўся далёка не ў першую чаргу.

Таму больш за ўсіх на гэтай пляцоўцы мяне ўразіў фін Ханц Разэнстром, які на падставе дыялогаў з бергманаўскіх "Шэптаў і крыкаў" зрабіў выдатны твор саўнд-дызайну, прымусіўшы голас літаральна пранікаць пад кару твайго мозгу. З ідэйнага пункту гледжання, — нічога асаблівага. Затое, чапляе.

Прастора былых складоў, якая ператвараецца ў арт-квартал Sporta-2, дазволіла мастакам разгарнуцца па поўнай. Але і тут экспазіцыя ставіць немалаважнае метадалагічнае пытанне: як працаваць з рэчаіснасцю? Тыя ці іншыя яе фрагменты — бы своеасаблівыя "знойдзеныя прадметы" — выкарыстоўваюцца ледзь не ў кожным з прадстаўленых твораў. Але хіба ў некаторых выпадках іх можна назваць самадастатковым аўтарскім выказваннем. Добра гэта ці не? Думаю, нават на такое пытанне адказы сёння будуць рознымі.

У адным з ангараў комплексу мастак родам з Венесуэлы (жыве ён, што характэрна, у Берліне) Марка Манцьель-Сота з дакументальнай дакладнасцю рэканструяваў бамбукавую хібару па-над вадой, у якіх жывуць рыбацкія сем'і ў раёне Макайба. Гук і відэа паглыбляюць эфект пагружэння. Праект, вядома, уражвае сваім маштабам — але не мастацкімі ідэямі. Да ўсяго, глядач адчувае сябе гэтакім турыстам — вонкавым назіральнікам, які ненадоўга завітаў ці не самыя камфортныя для жыцця закуткі свету для пераадолення свайго сенсорнага галадання.

Расійская мастачка Таус Махачава выкарыстала для сваёй гукавой інсталяцыі з паўсотні дынамікаў, размешчаных у адной прасторы. З іх гучаць урыўкі "мэйлаў", якія ўтрымліваюць банальныя звароты ветлівасці. Камунікатыўнае поле ўвасоблена як хаос, што забруджвае свядомасць. У той самы час, гэтае гукавое і сэнсавае смецце ўтварае і цікавы фармалістычны твор мастацтва. Фланіраваць паміж дынамікамі — занятак прыемны.

Іспанец Фернанда Санчас Кастылья прапануе ў нечым падобны спосаб утылізацыі непатрэбнай інфармацыі — на гэты раз, глабальнага характару, датычнай тых гістарычных падзей, пра якія сёння імкнуцца забыць. Яхта дыктатара Франка "Азор" стала сімвалам не лепшай для Іспаніі эпохі, і пасля яе завяршэння ўжо не магла выкарыстоўвацца па сваім прамым прызначэнні. Урад пастанавіў гэтае судна знішчыць, але мастак выкупіў яго каб пераўтварыць у "бязвінную" перад гісторыяй абстрактную скульптуру.

Амерыканец Трэвар Паглен рушыў у адваротным напрамку — ад абстрактнага да канкрэтнага. Навучыўшыся дайвінгу, ён зрабіў працягнутыя паміж кантынентамі падводныя фота інтэрнэт-кабеляў, матэрыялізаваўшы тым самым бадай самы актуальны чыннік цяперашняй цывілізацыі — які, паводле агульнага ўяўлення, у руках не памацаеш.

ГІСТАРЫЧНАЯ ПЛЕСНЯ

Яшчэ адна лакацыя біенале — кватэра вядомага латвійскага мецэната пачатку XX стагоддзя Крыстапа Морберга, вокны якой выходзяць на плошчу Свабоды — таксама была заспетая арганізатарамі ў прамежкавым стане. Не ведаю, у чым прычына таго, што фешэнебельнае колісь жытло з першым у Рызе душам апынулася ў даволі несамавітым стане. Затое, там часткова захаваліся арыгінальныя інтэр'еры, а гістарычная плесня адно дадавала ім шарму.

На гэтай пляцоўцы сімптаматычнае сёння прагненне завадатараў біенале гаварыць пра глабальныя праблемы дасягнула свайго апагею. Большасць выказванняў прысвечана сацыяльнай і палітычнай тэматыцы. Яны пра тое, пра што пішуць (альбо калісьці пісалі) газеты: напрыклад, пра мігрантаў. Але галоўная праблема ў тым, што далей за газеты аўтары зазвычай і не ідуць, дэманструючы журналісцкі, у прынцыпе, падыход. Прычым, як правіла, не лепшы яго варыянт.

Страшна бянтэжыць адна акалічнасць, з якой я ўжо не першы раз сутыкаўся. Заходнія куратары чамусьці лічаць, нібы адзінае, пра што могуць рэфлексаваць мастакі з Усходняй Еўропы — гэта змена гістарычных парадыгм і распад СССР. Як быццам, яны толькі пра гэта і думаюць — несупынна, круглыя суткі, цягам больш як чвэрці стагоддзя!

Ды і наогул — асабістая, экзістэнцыйная праблематыка ўсё часцей разглядаецца ў творах мастацтва хіба як нешта вытворнае ад сацыяльнай.

■■■

Дэвіз біенале гучыць песімістычна ці, прынамсі, трывожна: "Гэта было назаўжды, пакуль гэта не скончылася". У арыгінале фраза тычылася акурат распаду сацлагеру, але насамрэч яна, вядома, універсальная. Яе можна аднесці, напрыклад, і да парадыгмы таго, што мы сёння называем сучасным мастацтвам. Хаця на біенале пра гэта, вядома, не гаварылася.

К

Прадзюсар пасля шоу-бізнесу

І сярод прадзюсараў ёсць асобы культавыя. І наша краіна такіх мае. Хтосьці з іх працягвае ўвасабляць свае задумкі тут. Нехта пераключыўся на іншую дзейнасць. А яшчэ нехта зусім знік з далягляду, і толькі памяць захоўвае яго здзяйсненні. Руслан МАКАРАЎ некалі быў у Беларусі чалавек супераўтарытэтны. І ўжо даўно пакінуўшы радзіму, не-не, ды і "бярэ ў рукі шашкі" — нешта робіць у музычным бізнесе. Праўда, цяпер ужо з мецэнацкіх меркаванняў. А так ад гэтай сферы ён цяпер далёка. Але ў нас таксама ёсць рукі, і доўгія...

Алег КЛІМАЎ



З ТЭАТРА — У РОК

— У вас жа ёсць і акцёрская адукацыя? Можа, я нешта прапусціў, але мне не давялося бачыць вашыя работы ў якіх-небудзь кіна- і тэатральных пастаноўках.

— Я правучыўся некалькі курсаў у маскоўскім Тэатральным вучылішчы імя Шчукіна (цяпер гэта інстытут), але не скончыў яго. А ў Мінску ў тэатральных ролях мяне можна было бачыць толькі ў часы маёй маладосці: я граў у пастаноўках у Палацы чыгуначнікаў і ў Альтэрнатыўным тэатры на чале з Вітаўтасам Грыгалюнасам. Пасля сыходу з "шчупака" на сцэну не вяртаўся. У кіно пару разоў здымаўся ў эпізодах, але іх нават не варта ўзгадваць.

— А вось беларусы — старыя меламаны — выдатна памятаюць Руслана Макарава па музычнай дзейнасці. Як вас занесла ў гэтую сферу?

— У 1994 годзе я вярнуўся ў Мінск і вырашыў, што арганізацыя канцэртаў на вялікіх пляцоўках — гэта тое, што мне трэба, а галоўнае — людзям. Я ладзіў канцэрты расійскіх гуртоў "Алиса", "Ва-банкъ", "Чайф" у мінскім Палацы спорту. У гэты час музыкант Алег "Джагер" Мінакоў заразіў мяне і сваёй ідэяй гурта Rouble Zone. Мне да гэтага моманту падабаецца тая музыка, якую ён тады граў. Але потым наступілі не лепшыя часы — і для мяне, і для калектыву, мы расталіся і неўзабаве праект закрыўся. Але мы паспелі запісаць і выпусціць альбом Put Your Money... Now! Выдатны, з майго пункту гледжання, ва ўсіх сэнсах: ад музычнага матэрыялу і выканальніцкага драйву да афармлення і пазіцыянавання альбома сярод спажыўцоў. Ганарыся той работай!

ЧАС ДЛЯ ЎВАСАБЛЕННЯ ІДЭЙ

— Поле вашай дзейнасці ў беларускім шоу-бізнэсе і андэрграўндзе было дастаткова шырокім. Гэта і клубная праца, і арганізацыя канцэртаў, і прадзюсаванне асобных музыкантаў. Па сутнасці, вы былі адным з першых, хто ўкараняў масавую, забаўляльную і альтэрнатыўную культуру ў незалежнай Беларусі. Як вы тады адчувалі сябе ў гэтай ролі? Цяжкасцяў хапала?

— Адчуваў эйфарыйна-весела! Вельмі натхняла дружба і перыядычнае супрацоўніцтва з мастакамі і дызайнерамі Уладзімірам Цэслерам і Сяргеем Войчанкам (светлая яму памяць). У канцы 1990-х жыццё дазволіла адзначыцца мне ў Мінску і як радыёвядучаму на "Альфа радыё". Дзякуй за веру ў мяне і прасоўванне маіх ідэй тагачаснаму генеральнаму прадзюсару станцыі Сяргею Кузіну! Тады ж я стаў актыўна развіваць свае амбіцыі ў рэкламным бізнесе. Ну, а на мяжы тысячагоддзяў мне з партнёрамі ўдалося стварыць у сталіцы клуб Alcatraz.

А цяжкасцяў было мноства! Але праз гады магу сказаць, што галоўнай з іх была няздольнасць масавага спажыўца плаціць за высакаякасныя праекты. І большасць шэдэўраў таго часу былі створаны не "таму што", а "насуперак".

— Трыб'ют гурту Depeche Mode, які адбыўся ў 2002 годзе пры вашым непасрэдным удзеле, нарабіў шмат шуму ў былым Саюзе. Практычна ўвесь цвет беларускай альтэрнатывы "засвяціўся" пры запісе гэтага альбома, у якім было сапраўды шмат удалых трэкаў. Потым выйшла аўдыёпрысвячэнне гурту Deep Purple — таксама ваша задумка, але рэалізаваная ўжо расійскімі артыстамі. У прынцыпе, вы апярэдзілі ўвесь гэты постсавецкі кавер-рух!

— Альбом Personal Depeche быў выключна прадзюсарскім праектам, агульнай працай радыёвядучых Адама Старповіча, Андрэя Халадзінскага і маёй. Першапачаткова ніхто не верыў у тое, што мне ўдасца дамовіцца з праваўладальнікамі на ліцэнзію трэкаў саміх "дэпешаў". А потым усё закруцілася, і атрымаўся больш чым годны прадукт.

> *Агульнае згортванне музычнага рынку ў свеце ў 2008 — 2010 гадах прывялі мяне да рашэння шукаць новыя магчымасці прымянення маіх здольнасцяў.*

А трыб'ют "Піпл пра / to Purple" — гэта мая праца ў супрацоўніцтве з геніяльным расійскім прадзюсарам і музыкантам Ігарам Сандлерам. За два гады мы стварылі праект, які і да сённяшняга дня выклікае ва ўдзельнікаў гонар за яго ажыццяўленне. У рамках гэтых праектаў мне ўдалося пасупрацоўнічаць з грандыёзнымі выканаўцамі — і не толькі з Беларусі і Расіі. З многімі з іх мы блізка сябруем і дагэтуль. Гэта быў незабыўны час для ўвасаблення ўласных ідэй!

НЯЎДАЧЫ, ЯКІЯ НАТХНЯЮЦЬ

— Наватарскі для постсавецкай музыкі альбом "Руны" этнатрыа "Троіца" так і не "стрэліў" у Расіі — хаця разлік быў на гэта. Ён нават не быў там выдадзены. Мне чамусьці здавалася, што ў першую чаргу гэта няўдача "абламала" вас — прадзюсара пласцінкі, а не ўдзельнікаў гурта. Пасля чаго вы і сталі паступова адыходзіць ад музыкі. Я маю рацыю?

— Папраўлю вас: "Руны" быў не альбомам, а праектам! У якім "Троіца" з'яўлялася ў новым гучанні, у сваёй новай якасці наогул. А першы альбом праекта павінен быў называцца "Мір" — як першая руна славянскага руніцкага футарка. Гэта быў мой любімы музычны праект з сапраўды геніяльным (я і па-ранейшаму так лічу) гучаннем. І вялікі дзякуй лідару "Тройцы" Івану Кірчуку, як і ўсім астатнім удзельнікам задумы, за цярпенне, за разуменне таго, чаму мне так і не ўдалося давесці яе да выніку.

Але не гэтая, як вы кажаце, няўдача стала падставай для згортвання маёй актыўнасці на рынку шоу-бізнесу. Хутчэй, агульнае згортванне музычнага рынку ў свеце ў 2008 — 2010 гадах прывяло мяне да рашэння шукаць новыя магчымасці прымянення маіх здольнасцяў. Але да гэтага часу наш рэкорд-лэйбл MSH выпусціў нямала альбомаў самых розных выканаўцаў і праектаў, і не толькі ўласнага прадзюсавання. А крайнім, дваццатым па ліку, стала выданне ў 2013-м кампакту маіх блізкіх сяброў — гурта Kriwi — пад назвай Traukamurauka. Але гэта ўжо не бізнэс — дыск выпускаўся для прома гурта і падарункаў маіх структур. Між іншым, для стварэння падарункавага і рэкламнага прадукту выдавецкі лэйбл MSH працуе і сёння.

— А для продажу выдаваць музыку ўжо няма сэнсу, так? Таму і адбыўся ваш пераезд у Расію?

— Адно з вядучых на той момант рэкламных агенцтваў "Максіма" прапанавала мне ў 2001 годзе высокую кіруючую пасаду. Потым жыццё ў Маскве зацягвала ў самыя розныя сферы і бізнесу, і творчасці. Што заўсёды рабіла маё жыццё напоўненым.

— Паспрабуйце, калі ласка, пералічыць самае галоўнае з таго, чым вы цяпер займаецеся.

— Я сфакусаваны на праграмах, якія маюць дачыненне да лічбавай эканомікі. Добра сябе адчуваю як кансультант, партнёр і крэатар у праектах, звязаных з фінансавымі інструментамі (электронныя грошы, крыптавалюты, токены і гэтак далей). Вельмі захоплены праектам "Інстытут лічбавай эканомікі", у якім працую рэктарам. Адукацыйная і навуковая дзейнасць у гэтай сферы сёння больш за ўсё натхняе мяне. Менавіта ў лічбавай эканоміцы ёсць магчымасць прымяняць самыя розныя мае здольнасці і многія з назапашаных мною за жыццё ведаў.

— Наколькі вы адарваныя ад сучаснай музычнай Беларусі, яе цяперашняй культуры? Або нейкае ўяўленне пра іх маеце?

— З задавальненнем слухаю новыя творы сваіх даўніх беларускіх сяброў па шоубізе. Часам адкрываю новых для сябе выканаўцаў. І заўсёды радуюся поспехам музыкантаў з маёй гістарычнай радзімы. Але не магу сказаць, што разбіраюся ў актуаліях музычнага рынку Беларусі.

Па-ранейшаму сябрую з Валодзем Цэслерам, сачу за яго творчасцю. Для мяне цікавыя Зоя Луцэвіч і многія іншыя беларускія мастакі і дызайнеры. Увогуле, не скажу, што адарваны ад беларускіх культурных каранёў, якія з'яўляюцца, вядома, і часткай сусветнай культуры. У пэўнай ступені, яны для мяне сёння нават у прыярытэце.

— А наколькі адарваныя ад краіны, Мінска як такіх?

— На жаль, мае сённяшнія справы не дазваляюць часта бываць у Беларусі. Калі прылятаю ў Мінск, з задавальненнем хаджу на канцэрты сяброў, у новыя клубы і іншыя цікавыя месцы. Адно сталічнае кафэ на вуліцы Карла Маркса наведваю ў кожны свой прыезд — з ім звязаны мае глыбокія асабістыя ўспаміны. Таму повязь захоўваецца.

К

Даведка

Руслан МАКАРАЎ, 50 гадоў. Нарадзіўся ў Оршы. У 1991 годзе скончыў Дыпламатычную акадэмію МЗС СССР па спецыяльнасці "Знешнеэканамічныя адносіны і замежныя біржы". У 1999-м — ЕГУ па спецыяльнасці філасофія. Прэзідэнт Міжнароднага фонду "Чалавецтва", Нацыянальнага фонду садзейнічання развіццю міжнародных маладзёжных арганізацый, рэктар Інстытута лічбавай эканомікі, сапраўдны член Рускага геаграфічнага таварыства. З 2001 года жыве ў Маскве.

Іна НАРКЕВІЧ

Шчаслівы характар Меера Аксельрода

Мастак з сусветным імем Меер Аксельрод пакінуў у творчай спадчыне каля шасці тысяч жывапісных і графічных твораў. Больш за тысячу з іх захоўваюць сёння ў сваіх зборах восемдзесят музеяў свету. Вялікая частка належыць родным мастака. З сямейнай калекцыі было адабрана 85 ілюстрацый, якія ўнук мэтра, мастак Міхаіл Яхілевіч прывёз у Мінск на выставу "Меер Аксельрод. Кніжная графіка", якая працуе ў Дзяржаўным літаратурным музеі Янкі Купалы.

МІНСКАЯ БАГЕМА

У купалавым "Доме пад таполяй", які стаяў у некалькіх метрах ад сённяшняга музея, Меер Аксельрод бываў неаднаразова. На Кастрычніцкай вуліцы, на Паплавах — раёне, які атрымаў сваю назву з-за таго, што Свіслач неаднойчы выходзіла тут з берагоў, пагражаючы драўляным аднапавярховым дамам — ладзіліся шматлікія сяброўскія сустрэчы ў дзядзькі Янкі, якія працягвалі традыцыю літаратурных салонаў. Іх заўсёднікам быў і модны ў той час мінскі паэт, які пісаў на ідыш, — Зэлік Аксельрод, малодшы брат Меера.

Яны нарадзіліся ў звычайнай сям'і гандляра півам, што жыла ў гарадку Маладзечна. Дзед сямейства, які тлумачыў Тору і клапаціўся пра тое, каб унукі атрымалі традыцыйнае яўрэйскае выхаванне, старанна сачыў за тым, каб усе знойдзеныя аркушыкі з дзіцячай творчасцю — і вершы, і малюнкі — адразу знішчаліся. Але для развіцця талента гэта была не перашкода — як і цяжкае становішча сям'і, вымушанай у пачатку Першай сусветнай вайны пакінуць роднае месца ды з'ехаць ажно ў Тамбоў.

— З прыфрантавой зоны яўрэеў высялялі, бо баяліся, што з-за падабенства моў яны будуць супрацоўнічаць з немцамі, — распавядае загадчыца аддзела навукова-экспазіцыйнай і выставачнай работы Дзяржаўнага літаратурнага музея Янкі Купалы Марыя Барткова. — У 1918-м Аксельроды вярнуліся ў Беларусь, але пасля Рыжскай дамовы Маладзечна адышло да Польшчы. Таму сям'я пасялілася ў Мінску.

У гэты час Меер Аксельрод заканчвае рэальнае вучылішча і зарабляе грошы рэкламнымі плакатамі для кінатэатраў. Год ён працаваў чарцёжнікам ва ўпраўленні сувязі Чырвонай Арміі, а таксама наведваў выяўленчую студыю Пралеткульта. А Зэлік піша вершы і хутка набывае папулярнасць гарадскога лірыка. Усё яўрэйскае насельніцтва сталіцы і шматлікіх мястэчак чакае яго новыя творы, многія вучаць іх на памяць.

— Да Меера вядомасць прыйшла ў 1921 годзе, — кажа Марыя Барткова. — Для першай беларускай выставы, якую зладзіў Народны камісарыят асветы, мастак прапанаваў 25 сваіх работ. Яны выклікалі настолькі моцнае ўражанне, што Меер атрымаў ад Наркамасветы накіраванне на вучобу ў ВХУТЕМАС і з'ехаў у Маскву.

Графічным факультэтам у той час кіраваў вядомы мастак Уладзімір Фаворскі. Да свайго вучня ён ставіўся з вялікай прыязнасцю. Прызнаннем таленту стала запрашэнне ў таварыства "Чатыры мастацтвы" і далейшы ўдзел ва ўсіх яго выставах разам з Робертам Фалькам, Кузьмой Пятровым-Водкіным, Марціросам Сар'янам. Пасля заканчэння вучобы Меер Аксельрод застаўся жыць у Маскве. Там ён выкладаў, шмат падарожнічаў і заўсёды прывозіў з паездак незлічоныя замалёўкі з яўрэйскага жыцця. Акрамя таго, мастак пачаў ілюстраваць кнігі і супрацоўнічаць са шматлікімі савецкімі выдавецтвамі. Афармляў спектаклі ў яўрэйскіх тэатрах Мінска, Масквы і Кіева.

ТАЎРО ФАРМАЛІСТА

Разам з мастацкай калекцыяй, сям'я захоўвае яшчэ адзін скарб — гісторыю кахання Меера Аксельрода і яго жонкі Рыўкі. Іх знаёмства адбылося ў Мінску, куды часта прыязджаў мастак. Зэлік Аксельрод у той час збіраў вакол сябе кола сяброў і прыхільнікаў сваёй паэтычнай творчасці, у якое ўваходзіла і маладая паэтка Рэбека ці Рыўка Рубіна. Так яна і пазнаёмілася з Меерам.

Шчаслівае каханне яны пранеслі праз усё жыццё, поўнае нястачы і стратаў. Пасля стварэння Расійскай асацыяцыі пралетарскіх мастакоў у СССР была абвешчана барацьба за так званую чысціню пралетарскага мастацтва. Меера Аксельрода далучылі да тых, хто "скатваецца на пазіцыі буржуазнасці" і абвінавацілі ў фармалізме.

— Мне цяжка зразумець, як яго жывыя і рухавыя лініі, пяшчотны, далікатны малюнак можна абвінаваціць у фармалізме, — кажа Марыя Барткова. — Але гэтыя творы не адпавядалі ідэалагічнаму адчуванню партыйных функцыянераў. І ў той час сям'ю карміла кніжная графіка — калі ўдавалася атрымаць заказ. Аксельроды жылі настолькі бедна, што свежы чорны хлеб з маслам маглі дазволіць сабе толькі на дзень нараджэння любімай дачушкі Алены — у якасці святочнага стала. Родныя ўзгадвалі, як перажываў мастак, калі пры адным з пераездаў разбілася люстэрка, з дапамогай якога ён маляваў аўтапартрэты. На новае не было грошай. Дарэчы, жывапісны аўтапартрэт, які дэманструецца на нашай выставе, прапанаваў мінскі калекцыянер Аляксандр Радаеў. А ў складаныя часы выжываць Мееру дапамагаў шчаслівы характар. Ён умеў радавацца, нягледзячы на ўсе цяжкасці.

З ВУЛІЦЫ — НА СТАРОНКІ КНІГ

Магчыма, менавіта характар і дапамагаў мастаку бачыць свет ва ўсіх яго фарбах, умець ухапіць момант, перадаць рух, заўважыць важную дэталь. Яго дакладныя лініі ўвасабляюць гарадскія побытавыя сцэнкі, ствараюць характары. Для кніжнай графікі Аксельрод часта выкарыстоўваў замалёўкі з натуры. Менавіта на вуліцы быў знойдзены вобраз камінара для ілюстрацыі кнігі Ізі Харыка. Тры работы да яе, якія можна ўбачыць на выставе, засталіся толькі ў накідах, якія захоўваюцца ў сямейнай калекцыі. Кніга была падрыхтавана ў выдавецтве, Меер Аксельрод аднёс туды свае малюнкі, але свет яна не пабачыла. У 1937 годзе Ізі Харык быў арыштаваны і расстраляны. Куды зніклі вершы і малюнкі пасённяшні дзень невядома.

Можна ўявіць сабе, які гэта быў удар для братоў. Пісьменнік быў добрым сябрам Зэліка. Ва ўспамінах сучаснікаў застаўся і такі цікавы выпадак. У 1936 годзе Зэлік Аксельрод, Ізі Харык і Янка Купала адпачывалі ў Падмаскоўі. Неўзабаве ў іх скончыліся грошы. За фінансаванне беларускіх літаратараў адказваў у той час таварыш Лесін. Менавіта яму сябры і вырашылі даслаць жартоўную тэлеграму, у якой былі і словы на ідыш: "Свет без грошай цесны, гоп рахмонес Лесін". Апошнія словы азначалі — "май літасць, Лесін". Але пільная тэлеграфістка, якая не ведала ідыш, выклікала міліцыю. Толькі дзякуючы Купалу, які хутка прыдумаў гісторыю пра тое, што "гоп", "рахмонес" і "лесін" — гэта іх прозвішчы, гісторыя скончылася добра.

Дарэчы, у Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі захоўваецца рарытэтная кніга Янкі Купалы, перакладзеная на ідыш Зэлікам Аксельродам і Ізі Харыкам. А вершы Аксельрода, у сваю чаргу, найчасцей перакладаў на беларускую Змітрок Бядуля.

— Я ўяўляю сабе, як 11 красавіка 1938-га года Янка Купала атрымлівае свежы нумар "ЛіМа" і чытае верш Зэліка Аксельрода "Менскія завулкі" ў перакладзе Петруся Глебкі, — кажа Марыя Барткова.

Можа, вам не любы
(ваша справа!)
Менскія завулкі
з крывізной, —
Мне ж па сэрцы
ў залатой аправе
Месяц над дзіраваю
страхой.

Напярэдадні вайны Зэлік Аксельрод быў арыштаваны і расстраляны. Сям'я Меера паехала ў эвакуацыю, а мастак застаўся ў Маскве, маляваў антыфашысцкія плакаты і ілюстрацыі. Таксама ён паўдзельнічаў у стварэнні фрэсак да знакамітага фільма "Іван Грозны" рэжысёра Сяргея Эйзенштэйна, які здымалі ў Алма-Аце.

РАЗНАСТАЙНАСЦЬ ЛІНІІ

— Да нас у музей Міхаіл Яхілевіч прывёз ілюстрацыі да кніг, якія выходзілі ў 1920 — 1960-х гадах. Выкананыя ў розных тэхніках, яны дазваляюць наведвальнікам скласці найбольш поўнае ўражанне пра яго графічную творчасць, — адзначае Марыя Барткова. — Ёсць ілюстрацыі і да кнігі брата, вельмі цікавы іх сумесны партрэт. Увогуле, Меер Аксельрод — майстар мініяцюры. У графічнай серыі да кнігі Самуіла Галкіна "Вершы. Балады. Драмы" ён прыгожа падкэслівае ландшафт Мінска. Дарэчы, гэты пісьменнік таксама быў арыштаваны, і ад расстрэлу яго выратаваў інфаркт.

Ёсць на выставе і ілюстрацыі да п'есы Праспэра Мэрымэ "Жыкерыя", якая ставілася ў яўрэйскім тэатры ў Маскве. Да спектакля Аксельрод зрабіў столькі выдатных эскізаў, што было вырашана ўзяць іх у якасці малюнкаў да кнігі. Прадстаўлены і малюнкі да казкі Змітрака Бядулі "Сярэбраная табакерка", варыянты вокладкі да яе, выкананыя ў рознай стылістыцы, і нават партрэт пісьменніка. Вельмі дэталёвыя, рэалістычныя, характарныя ілюстрацыі да кнігі Якуба Коласа "На ростанях".

Цікавы экспанат на выставе — кніжка Янкі Купалы "Арлянятам". Справа ў тым, что малюнкі да яе рабіў Меер Аксельрод, ён жа прапанаваў і свой варыянт вокладкі. Гэта было ў 1940 годзе. Але з-за вайны кніжка выйшла толькі ў 1945-м. Вокладка ўжо была зусім іншай, а ілюстрацыі засталіся тыя самыя. Толькі імя мастака ў ёй не было пазначана.

■■■

Імя Меера Аксельрода пачало вяртацца да гледача ўжо пасля яго смерці. Работы мастака набылі Траццякоўская галерэя і Музей выяўленчых мастацтваў імя Аляксандра Пушкіна. У 1990-ыя выставы прайшлі ў Нью-Ёрку, Лондане, Іерусаліме. У Год малой радзімы творчая спадчына мастака вяртаецца і да беларускіх аматараў выяўленчага мастацтва. У чэрвені першая экспазіцыя адкрылася ў Маладзечне, у Мінскім абласным краязнаўчым музеі, які дапоўніў яе 12 жывапіснымі работамі са сваіх збораў. А налета плануецца яшчэ адзін буйны выставачны праект.





Дзетачка і Маргарытачка

Хто яны, Сяргей і Маргарыта Канёнкавы? Дэтэктыўная загадка, не разгаданая да канца

(Працяг. Пачатак у № 32.)

Сяргей Канёнкаў. Партрэт Маргарыты Варанцовай. 1918 год.

ЛЁС СТЫХІЙНАГА ТАЛЕНТУ

— Сярожа ў сваёй аўтабіяграфіі напісаў, што ажаніўся на мне — нібыта, студэнтцы юрыдычнага факультэта ўніверсітэта, — у 1922 годзе, — пачала свой расповед Маргарыта Васільеўна. — Дата правільная, але на самой справе я тады вучылася на прыватных юрыдычных вышэйшых жаночых курсах, заснаваных Варварай Аляксандраўнай Палтарацкай. Я яму казала пра гэта, але ён выпраўляць недакладнасць не пажадаў. Да нашага вяселля мы сустракаліся каля шасці гадоў. А да гэтага я была нявестай прыяцеля Сяргея — вядомага тады скульптара, жывапісца і графіка Пятра Ігнатавіча Брамірскага. Збіралася нават за яго замуж...

— Да майго сораму, я нічога не чуў пра такога мастака.

— Нічога дзіўнага. Гэтага чалавека вялікага стыхійнага таленту, непапраўнага рамантыка, нястомнага апавядальніка, і сёння мала хто ведае. Між тым, яго ў юнацтве маляваў сам Урубель. А Пеці, у сваю чаргу, у 1910 годзе было наканавана зняць з Урубеля пасмяротную маску. Я пазнаёмілася з Пятром Ігнатавічам у жніўні 1915 года пасля яго вяртання з вайны.

Увогуле, яго кароткая біяграфія была вельмі ўражвальная: вучыўся ў Маскоўскім вучылішчы жывапісу, скульптуры і дойлідства ў Паола Трубяцкога, таварышаваў з Савам Мамантавым — працаваў у яго ганчарных майстэрнях; сустракаўся з Мішам Ларыёнавым, Валодзем Татліным, юным геніем Васем Чакрыгіным, з Канчалоўскім. Моцна сябраваў і з Канёнкавым. Дарэчы, дзякуючы Сярожавай пратэкцыі, у 1918 годзе Пётр атрымаў ад Луначарскага заказ на помнік Сурыкаву. Ён марыў паставіць яго з ацынкаванага ліставога жалеза наўпрост на Краснай плошчы — на Лобным месцы (як вы памятаеце, гэта месца дзеяння сурыкаўскай карціны "Раніца стралецкага пакарання"): апакаліптычны анёл з мячом і чарай у руках. Але гэтая мара не здзейснілася...

Пеця па сваёй натуры быў чалавекам даволі багемным, у юнацтве жыў дзе давядзецца, туляўся па гарышчах знаёмых і сяброў, бедаваў, часта галадаў. А свой талент скульптара і малявальшчыка рэалізоўваў, у асноўным, у майстэрнях прыяцеляў, у начны час. У мяне заставалася шмат яго бліскучых малюнкаў, гуашаў і акварэляў, частку з якіх я перадала Траццякоўцы.

Карацей кажучы, мяне падкупілі яго Божы дар, дабрыня, адкрытасць і прыстойнасць. Мне вельмі хацелася яму дапамагчы, дзеля чаго я гатовая была рызыкнуць: стаць ягонай жонкай. Але ўмяшаўся сам Лёс... Пеця неяк паказаў маю фотакартку Канёнкаву, а той адразу ж закахаўся ў маё аблічча. Асабліва, як ён потым распавядаў, яго чамусьці скарылі мае пальцы рук і паварот галавы. Сяргей папрасіў Пецю пазнаёміць яго са мной. Вось з гэтага ўсё і пачалася — так скажам, узаемнае каханне на ўсё жыццё...

Калі мы пажаніліся, мне споўнілася 28 гадоў, Сярожа быў на 22 гады старэйшым. А неўзабаве пасля таго, як з Рыты Варанцовай я ператварылася ў Маргарыту Канёнкаву, мы праз Рыгу з'ехалі з выставай рускага і савецкага мастацтва ў Нью-Ёрк. Думалі, на кароткі час, але аказалася — больш, чым на два дзясяцігоддзі.

— А што сталася з Брамірскім? — запытаў я.

— У пачатку студзеня 1920-га ён памёр ад сыпнога тыфу на 34-м годзе жыцця ў Стара-Басманнай бальніцы. Мы з Сярожам у той час былі ў ад'ездзе і нічога не ведалі пра трагічны лёс Пятра Ігнатавіча. Потым нам эскулапы сказалі, што пахавалі яго ў агульнай магіле для тыфознікаў. І дзе цяпер ляжаць яго астанкі — нікому невядома...

У РАЗІНСКАЙ КАСАВАРОТЦЫ

— Ну, а з Сярожам я пазнаёмілася ў пачатку лета 1916 года ў Маскве ў адной мілай інтэлігентнай кампаніі ў доме ў Трубнікаўскім завулку, у кватэры доктара Івана Андрэевіча Буніна, дзе я тады здымала пакой, — працягнула Маргарыта Васільеўна. — Гаспадары кватэры адзначалі нейкую падзею. Запрасілі гасцей, у тым ліку і сваіх старых прыяцеляў — Пецю Брамірскага і Канёнкава. Там, у гэтай кампаніі, я ўпершыню ўбачыла Сяргея Цімафеевіча — шырока вядомага ў мастакоўскім свеце скульптара, увенчанага мноствам узнагарод і тытулаў. Я яшчэ не ведала, што Канёнкаў, аказваецца, ужо прыкмеціў мяне па той самай фотакартцы. Памятаю, мой Пеця быў апрануты ў шырокі пінжак з сяброўскага пляча Канчалоўскага і ў вузкія галіфэ, пазычаныя ў мастака Колі Васільева. Свайго прыстойнага касцюма ў яго тады не было.

Канёнкаў быў у чырвонай касаваротцы і чорных штанах, запраўленых у высокія, да бляску начышчаныя боты. Твар апраўлены цёмнай бародкай, вострыя карыя вочы. Я тады падумала: напэўна, менавіта такім быў данскі казак Сцёпка Разін. І як быццам у ваду глядзела: Сяргей сапраўды заўсёды адчуваў сябе Разіным і, трохі падпіўшы, любіў казаць, б'ючы сябе ў грудзі: "На свеце было тры воглаты: Ярмак Цімафеевіч, Сцяпан Цімафеевіч і Сяргей Цімафеевіч..."

Той вечар прайшоў у цёплай абстаноўцы: пілі шампанскае, гаварылі пра літаратуру, весяліліся, нешта спявалі, слухалі цудоўны аповед Канёнкава пра яго падарожжа ў Грэцыю і Егіпет, якое ён здзейсніў пару гадоў таму. А на наступны дзень Сяргей даслаў мне велізарны кош кветак і запрашэнне наведаць яго студыю. Пасля мы паехалі ў знакаміты рэстаран "Стрэльна", дзе выступаў славуты цыганскі хор пад кіраўніцтвам Марыі Лебедзевай. Я ўвачавідкі пераканалася, што Сяргей Цімафеевіч там даўно быў сваім чалавекам. Цыганы з гітарамі акружылі мяне, наперабой пытаючы, што я буду піць — шампанскае ці кагор. Я адказала: малако. Тыя проста асалапелі і нешта весела залапаталі па-цыганску.

Словам, з тых часоў я стала часта сустракацца з Сярожам, за што ад сваякоў і знаёмых атрымлівала папрокі: маўляў, ён жа значна старэйшы за мяне, і наогул — п'яніца і распусник, ніводнай спадніцы не прапускае. Я ўжо ведала, што яго жонка Таццяна Якаўлеўна Каняева — дачка качагара, былая натуршчыца, якая пазіравала Сярожы для выявы Нікі — грэцкай багіні перамогі. Гэтая скульптура ў той час карысталася шалёнай папулярнасцю на выставах. Усё скончылася тым, што не вытрымаўшы разгульнага жыцця мужа, Таццяна разам з сынам Кірылам пайшла да іншага — здаецца, да аднаго з братоў вядомага скульптара Мітрафана Рукавішнікава. Першы ж сын Сярожы — Марык — памёр яшчэ ў маленстве ад менінгіту.

Нягледзячы на ўсе гэтыя бытавыя перыпетыі і драмы, развітаўшыся са сваім жаніхом Пятром Брамірскім, я мужна працягвала сустракацца з Сяргеем — спачатку таемна, потым у адкрытую, пакуль ў 1922 годзе мы не абвянчаліся.

ГУЛЬНЯ Ў МЯЧ

Думаю, што чытачам будзе цікава даведацца і версію самога Канёнкава аб тым, як складваліся яго адносіны з Маргарытай Варанцовай. Шмат гадоў пазней за тыя падзеі ён успамінаў: "У адной кампаніі я ўбачыў высокую стройную дзяўчыну. Не памятаю, што мы казалі адно аднаму, калі знаёміліся. Потым гулялі ў мяч. Мы перакідалі праз сетку гумовы мяч, і я любаваўся ёю — лёгкай, стройнай, вытанчанай. Мы вельмі доўга гулялі ў мяч: гэтая карціна засталася ў мяне ў памяці на ўсё жыццё...

Я запрасіў Маргарыту да сябе ў студыю, і яна пагадзілася прыйсці. Але падаспелі летнія вакацыі, і яна з'ехала на радзіму, у горад Сарапул на Каме. Я не мог вытрымаць расстаяння: адправіўся ў Сарапул следам за ёй. З прыстані паслаў ёй запіску. Маргарыта неўзабаве прыйшла. Як цяпер памятаю яе залатыя валасы, белую шаўковую кофтачку і сінюю спадніцу. Вялікая была радасць сустрэчы. Маргарыта прывезла мяне знаёміцца з бацькамі. Сустрэлі мяне гасцінна. Бацька Маргарыты, прысяжны паверaны Іван Цімафеевіч, быў супраць нашага вяселля з-за вялікай розніцы ў веку. Ён быў цяжка хворы і таму з выгляду пануры і нелагодны.

Вярнуўшыся ў Маскву, я пачаў рабіць па памяці партрэт Маргарыты і з нецярплівасцю чакаў яе вяртання. Яна прыехала ў Маскву і прыйшла да мяне ў майстэрню. Усе гады, якія папярэднічалі нашай жаніцьбе, Маргарыта была верным сябрам і памочнікам ва ўсіх маіх справах і пачынах..."

■■■

— Маргарыта Васільеўна, вы тут успомнілі пра аўтабіяграфію Сяргея Цімафеевіча. Хачу запытацца, а ці была яна апублікаваная? — пацікавіўся я.

— Не, не была. Рукапіс, напісаны ўвосень 1955 года, некуды знік, хтосьці яе скраў. Але, на шчасце, захаваўся машынапіс. Хочаце, пакажу?

Канешне! Аўтабіяграфія займала, калі не памыляюся, крыху больш за пяць старонак машынапіснага тэксту. Я папрасіў дазволу выпісаць з яе некаторыя фрагменты. Яна пачыналася так: "*Я нарадзіўся ў сялянскай сям'і ў вёсцы Караковічы Смаленскай губерні 28 чэрвеня (10 ліпеня) 1874 года. Маці памерла, калі мне было тры гады, але да гэтага часу памятаю яе незвычайна прыгожы твар...*"

Далей ішлі факты біяграфіі: пра дзяцінства і першы мастацкі досвед, пра вучобу ў Вучэльні жывапісу, скульптуры і дойлідства, пра першую паездку ў Італію, пра гады вучобы ў Акадэміі мастацтваў, пра першыя творчыя работы і першыя выставы, пра сустрэчы з Леніным... Літаральна некалькі словаў — пра жыццё ў ЗША і вяртанне на радзіму пасля доўгай адсутнасці. Далей — пра абранне акадэмікам і гэтак далей. І заканчвалася аўтабіяграфія словамі пра тое, што для яго "вялікае шчасце тварыць для народа", што ён адчувае ў сабе велізарны прыліў сіл і энергіі і марыць, каб яго творы былі вартыя "нашага вялікага і мудрага народа". Да гэтага часу мне незразумела, чаму такая "правільная" аўтабіяграфія так і не была апублікаваная пры жыцці скульптара.



Сяргей Канёнкаў. 1900 год.

Барыс КРЭПАК

Працяг — у наступных нумарах "К".

МУЗЕІ

НАЦЫЯНАЛЬНЫ МАСТАЦКІ МУЗЕЙ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ
г. Мінск, вул. Леніна, 20.
Тэл.: 327 45 62.
Экспазіцыі:
■ "Мастацтва Беларусі XII — XVIII стст.";
■ "Мастацтва Беларусі XIX — пач. XXI стст.";
■ "Мастацтва Беларусі XX — пач. XXI стст.";
■ "Мастацтва Расіі XVIII — пач. XX стст.";
■ "Мастацтва краін Заходняй і Цэнтральнай Еўропы XVI — XX стст.";
■ "Мастацтва краін Усходу XIV — XX стст.".
Выставы:
■ Выстава **"Сусвет Язэпа Драздовіча"** — да 30 снежня.
■ Лекцыя **"Тры жыцці Язэпа Драздовіча"** — 18 жніўня. Пачатак а 16-й.
■ Выстава **"Equos. Kon. Конь"** — да 26 жніўня.
■ Маштабная рэтраспектыўная выстава твораў Ізраіля Басава **"Прамудрасць збудавала сабе дом ..."**, прымеркаваная да 100-годдзя з дня нараджэння майстра — да 16 верасня.

Філіялы музея

МУЗЕЙ "ДОМ ВАНЬКОВІЧАЎ. КУЛЬТУРА І МАСТАЦТВА І ПАЛОВЫ XIX СТ."
г. Мінск, вул. Інтэрнацыянальная, 33а.
Тэл.: 327 88 78.
Пастаянныя экспазіцыі:
■ **"Інтэр'еры шляхецкай сядзібы"**.
■ **"Жыццё і творчасць Валенція Ваньковіча"**.
■ **"Сядзібны партрэт XVII — сяр. XIX стст."**.

МУЗЕЙ БЕЛАРУСКАГА НАРОДНАГА МАСТАЦТВА Ў В. РАЎБІЧЫ
Спарткомплекс "Раўбічы", Мінскі раён. Тэл.: 507 44 69.
■ Пастаянная экспазіцыя.
■ Майстар-класы па стварэнні лялек-мотанак, ткацтве паясоў альбо саломапляценні (на выбар) — кожную нядзелю. Пачатак а 12-й.

НАЦЫЯНАЛЬНЫ ГІСТАРЫЧНЫ МУЗЕЙ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ
г. Мінск, вул. К.Маркса, 12.
Тэл.: 327 43 22.

Экспазіцыі:
■ Абноўленая экспазіцыя **"Старажытная Беларусь"**.
■ "Беларусь XVI — XVIII стст. у партрэтах і геральдыцы".
■ Бестэрміновая акцыя **"Адзіны білет"**, якая дазваляе мінчанам і гасцям сталіцы наведаць музей і яго шэсць філіялаў, набыўшы ўсяго адзін білет у любым з іх.
■ Аўтарскі праект Ахрэма Белабровіка **VKL3D**.
■ Акцыя **"Вольнае пяніна"** — кожны дзень з 16.00 да 19.00.
Выставы:
■ Выстава **"Беларусь: адраджэнне духоўнасці"**.
■ Выстава **"Ад рымскага дэнарыя да беларускага рубля"**.
■ Выстава твораў беларускай мастачкі Аксаны Шаляпінай **"Цветоотражение"** — да 19 жніўня.
■ Мастацкая выстава **"Шляхамі стагоддзяў"** (экспазіцыя складаецца з выпускных работ вучняў Слуцкай дзіцячай мастацкай школы).
■ Персанальная выстава мастака Эдуарда Мацюшонка **"Радзіма. Рэканструкцыя"**,

прымеркаваная да Года малой радзімы — да 2 верасня.
■ Выстава **"Мінск рэальны і віртуальны"** (у экспазіцыі прадстаўлены ўнікальныя фотаздымкі горада) — да 24 жніўня.

Філіялы музея

ДОМ-МУЗЕЙ І З'ЕЗДУ РСДРП
г. Мінск, пр-т Незалежнасці, 31а.
Тэл.: 290 68 47.
■ **Абноўленая экспазіцыя**, прымеркаваная да 100–годдзя Кастрычніцкай рэвалюцыі (залы дапоўнены новымі прадметамі амаль з усіх фондавых калекцый музея).
■ Выстава **"Дзве памяці адной вайны"**, падрыхтаваная сумесна з Народным Саюзам Германіі па догляду за ваеннымі магіламі.

МУЗЕЙ СУЧАСНАЙ БЕЛАРУСКАЙ ДЗЯРЖАЎНАСЦІ
г. Мінск, вул. К.Маркса, 38.
Тэл.: 327 46 11.
■ Пастаянная экспазіцыя.
■ Да 30 верасня 2018 года філіял праводзіць адкрыты конкурс фатаграфій і відэаролікаў **"Мы сваёй Беларуссю ганарымся!"** да Года малой радзімы.

МУЗЕЙ ПРЫРОДЫ І ЭКАЛОГІІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ
г. Мінск, вул. К.Маркса, 12.
Тэл.: 327 06 33.
Экспазіцыі:
■ "Сезонныя змены".
■ "Вадаёмы і насельнікі прыбярэжных раслін".
■ "Хвойны тып лесу і насельнікі змяшанага лесу".
■ "Насельнікі ліставога і змяшанага лесу".
■ "Ахоўныя прыродныя ўчасткі, рэдкія віды жывёл".

г. Мінск, вул. Казінца, 117 (будынак кінатэатра "Электрон").
Тэл.: +37529 123 60 53.
■ Выстава **"Сафары парк"** — да 31 жніўня.
■ Атракцыён **"Стужачны лабірынт"**.
■ Атракцыён **"Лазерны квэст"**.

МУЗЕЙ ГІСТОРЫІ ТЭАТРАЛЬНАЙ І МУЗЫЧНАЙ КУЛЬТУРЫ
г. Мінск, Музычны зав., 5.
Тэл.: 220 26 67.
Пастаянныя экспазіцыі:
■ "Вытокі тэатральнай і музычнай культуры на беларускіх землях"; "Музычная і тэатральная культура Беларусі ў X — XIX стст."; "Беларуская музычная культура XX ст."; "Тэатральная культура Беларусі XX ст.".
■ Выстава **"Зачараваны музыкай"** (да 80-годдзя Ігара Лучанка) — да 24 жніўня.

ГАСЦЁЎНЯ УЛАДЗІСЛАВА ГАЛУБКА
г. Мінск, вул. Старавіленская, 14. Тэл.: 286 74 03.
■ Пастаянная экспазіцыя.
■ Выстава **"Па слядах Гары Потэра"** — да 2 верасня.
Майстар-класы:
■ Музейныя заняткі **"Тэатральная лялька"** для дзяцей 5+.
■ Інтэрактыўныя музейныя заняткі **"Асновы акцёрскага майстэрства"** для дзяцей ад 5 да 10 гадоў.

МУЗЕЙ ГІСТОРЫІ БЕЛАРУСКАГА КІНО
г. Мінск, вул. Свярдлова, 4.
Тэл.: 327 10 75.
■ Пастаянная экспазіцыя.

БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ МУЗЕЙ ГІСТОРЫІ ВЯЛІКАЙ АЙЧЫННАЙ ВАЙНЫ
г. Мінск, пр-т Пераможцаў, 8.
Тэл: 327 11 66; 203 07 92.
Музей працуе: пн. — выхадны, аўт. — нядз. — ад 10-й да 18-й, сер. — ад 12-й да 20-й.
■ Часовая экспазіцыя **"Авіятары Беларусі"**— сумесны праект музея і камандавання 50-й змяшанай авіяцыйнай базай ВПС і войскаў СПА Узброеных Сіл Рэспублікі Беларусь — да 15 верасня.

НАЦЫЯНАЛЬНЫ ГІСТОРЫКА-КУЛЬТУРНЫ МУЗЕЙ-ЗАПАВЕДНІК "НЯСВІЖ"
г. Нясвіж, вул. Ленінская, 19.
Тэл.: (8–01770) 2 06 60, 2 06 02; +37529 551 80 51, + 37529 190 31 49.
Палацавы ансамбль
■ Пастаянная экспазіцыя.
■ Выставачны праект **"Старыя героі — новы свет"** — да 7 кастрычніка.
■ Выстава **"Чвэрць стагоддзя"**, прысвечаная юбілею Нацыянальнага гісторыка-культурнага музея-запаведніка "Нясвіж".
■ Гістарычны квэст "Таямніцы і загадкі палаца Радзівілаў". Па папярэдніх заяўках.

Сектар экскурсійнай і інфармацыйнай дзейнасці
Вул. Гейсіка, 1.
■ Пастаянная экспазіцыя.
■ Персанальная выстава Кацярыны Сумаравай **"Суб'ектыўны краявід"** — да 2 верасня.
Ратуша
Вул. Савецкая, 3.
■ Пастаянная экспазіцыя.
■ Квэст **"Выхадкі старога захавальніка"**. Па папярэдніх заяўках.
Слуцкая брама
■ Выстава **"З імем святога Юрыя"** — да 30 верасня.
Выставачная зала "Libra"
г. Мінск, пр. Незалежнасці, 37
■ Міжнародная выстава **"Недзе на захад ад Мінска... Паўсядзённае жыццё Заходняй Беларусі 1920 — 1930 гг."** (сумесна - з Нацыянальнай бібліятэкай Рэспублікі Беларусь, Музеям Крэсаў і зямлі Астроўскай (Польшча— да 31 студзеня 2019 г. Сумесна з Нацыянальнай бібліятэкай Рэспублікі Беларусь, Музеям Крэсаў і зямлі Астроўскай (Польшча).

ЗАМКАВЫ КОМПЛЕКС "МІР"
г.п. Мір, Карэліцкі раён, Гродзенская вобласць.
Тэл.: (8–01596) 2 82 91, (8–01596) 2 82 70.
■ Пастаянная экспазіцыя.
■ Тэатралізаваная экскурсія **"І зноў ажываюць паданні"**.
■ Экскурсія з элементамі дэгустацыі **"У госці да Пане Каханку"**.
■ Квэст **"Таямніца двух куфраў"**.
■ Квэст **"Белы слон"**.
■ Дзіцячая тэатралізаваная экскурсія **"Чароўная гісторыя ў Мірскім замку"**.
■ Музейныя заняткі.
■ Музейная фотапляцоўка.

ДЗЯРЖАЎНЫ ЛІТАРАТУРНА-МЕМАРЫЯЛЬНЫ МУЗЕЙ ЯКУБА КОЛАСА
г. Мінск, вул. Акадэмічная, 5.
Тэл.: 294 91 96.

Экспазіцыі:
■ **"Якуб Колас. Жыццё і творчасць"**.
■ Экспазіцыя **"Склеп"** на сядзібе Якуба Коласа.
■ Часовая экспазіцыя **"У любові да роднай зямлі"**.
■ Тэматычныя экскурсіі і лекцыйныя заняткі.
■ Тэатралізаваныя прадстаўленні паводле беларускіх народных казак.
■ Музейныя майстар-класы і заняткі.
■ Мультымедыйны комплекс **"Чалавек. Асоба. Час"**.
■ Пешая экскурсія **"Мясцінамі Коласа ў Мінску"**.
■ Інтэрактыўныя праграмы для сямейных наведвальнікаў, квэст-гульня **"Таямніцы дома Песняра"**.
Акцыі:
■ **"Самы лепшы дзень"** (дзень нараджэння ў музеі).
■ Віншаванне ад музея, фотасесія **"У дзень вяселля — у музей!"**
■ Музейная культурна-адукацыйная праграма **"Летнія канікулы ў Доме Коласа"** — да 30 жніўня.

ДЗЯРЖАЎНЫ ЛІТАРАТУРНЫ МУЗЕЙ ЯНКІ КУПАЛЫ
г. Мінск, вул. Янкі Купалы, 4.
Тэл.: 327 78 66.
■ Пастаянная экспазіцыя **"Шляхі"** з праглядам роліка ў 3D-фармаце і інтэрактыўнай зонай для дзяцей **"Хлопчык і лётчык"**, галаграфічным тэатрам.
■ Інтэрактыўныя музейныя праграмы **"У пошуках папараць-кветкі"**, **"Вячоркі"**.
■ Выстава **"Меер Аксельрод. Кніжная графіка"** — да 25 жніўня.

МУЗЕЙ ГІСТОРЫІ ГОРАДА МІНСКА
г. Мінск, вул. Рэвалюцыйная, 10. Тэл.: 321 24 30.

Філіялы Музея гісторыі горада Мінска

ГАРАДСКАЯ МАСТАЦКАЯ ГАЛЕРЭЯ ТВОРАЎ Л.Д. ШЧАМЯЛЁВА
г. Мінск, вул. Рэвалюцыйная, 10. Тэл.: 321 24 30.

Экспазіцыя:
■ **"Жыццёвы і творчы шлях народнага мастака Беларусі Леаніда Шчамялёва"**.
■ Выстава фатаграфіі **"Мінск пад прыцэлам"** — да 16 верасня.

МАСТАЦКАЯ ГАЛЕРЭЯ МІХАІЛА САВІЦКАГА
г. Мінск, пл. Свабоды, 15.
Тэл.: 321 24 30.
Экспазіцыі:
■ **"Мастак. Грамадзянін. Герой"**. Прысвечана Ганароваму грамадзяніну г. Мінска Міхаілу Савіцкаму.
■ **"Мінск губернскі. Шляхецкі побыт"**.
■ Вулічная выстава **"Польшча — краіна аб'ектаў ЮНЕСКА"** — да 26 жніўня.
■ Фотапраект Ірэны Гудзіеўскай **"Сімвалы Беларусі. У пошуках ..."**, прысвечаны Году малой радзімы — да 2 верасня.

МІНСКАЯ ГАРАДСКАЯ РАТУША
г. Мінск, пл. Свабоды, 2а.
Тэл.: 321 24 30.
Экспазіцыя:
■ **"Мінск у гістарычнай прасторы. Картаграфічны кабінет"**.

МУЗЕЙ "ЛОШЫЦКАЯ СЯДЗІБА"
г. Мінск, праезд Чыжэўскіх, 8-2.

■ Пастаянная экспазіцыя.
■ Выстава **"Куфэрак: на вайне і ў бальнай залі"** — да 9 верасня.

ФЛІГЕЛЬ ЛОШЫЦКАГА СЯДЗІБНА-ПАРКАВАГА КОМПЛЕКСУ
г. Мінск, праезд Чыжэўскіх, 10.
Тэл.: 285 18 86.
Экспазіцыя:
■ **"Кола часу"** — прадметы гарадской і сялянскай культуры кан. XIX — сяр. XX стст.

ЭКСПАЗІЦЫЯ "КАРЭТНАЯ"
г. Мінск, вул. Кірылы і Мяфодзія, 8. Тэл.: 321 24 30.
■ **"Сані • вазок; каляска • брычка; карэта • вупраж"** (пастаянная экспазіцыя па гісторыі гужавога транспарту жыхароў Мінска XIX — пачатку XX стст.).
■ Віртуальная гульня **"Карэтны майстар"**.

ЭКСПАЗІЦЫЯ "МІНСКАЯ КОННАЯ ЧЫГУНКА"
г. Мінск, вул. Кірылы і Мяфодзія, 6.
■ Экспазіцыя складаецца з некалькіх раздзелаў, якія распавядаюць пра жыццё Мінска 1890 — 1920-х гг.

АРХЕАЛАГІЧНЫ МУЗЕЙ
г. Мінск, вул. Кірылы і Мяфодзія, 6. Тэл.: 321 24 30.

АРТ-ГАСЦЁЎНЯ "ВЫСОКАЕ МЬСТА"
г. Мінск, вул. Герцэна, 2а.
Тэл.: 321 24 30.
■ Інтэрактыўны праект пра гісторыю мінскай фатаграфіі **"Прывітанне з Мінска"** — да 26 жніўня.

ЛІДСКІ ГІСТОРЫКА-МАСТАЦКІ МУЗЕЙ
г. Ліда, вул. Перамогі, 37а.
Тэл.: (8-0154) 53 50 64.
Пастаянныя экспазіцыі:
■ **"Прырода Лідчыны"**.
■ **"Сучаснае мастацтва краю"** (жывапіс, графіка, скульптура, мастацкае шкло).
Выставы:
■ Выстава **"Майстэрня заслужанага дзеяча мастацтваў Беларусі, сябра Саюза мастакоў Беларусі Уладзіміра Мурахвера"**.
■ **"Вядзем пачатак мы ад Гедыміна..."**.
■ Мемарыяльны пакой **Валянціна Таўлая**.
■ Выстава са збору А.Фішбайна **"Рэчы побыту канца XIX — пачатку XX стст."**.
■ Музейна-вобразная зала **"Хрушчоўка 60-х"**.
■ Выстава **"Вайны свяшчэнныя старонкі"**.
■ Выстава **"Надзейны шчыт краіны"**.
■ Выстава **"Падарожжа ў гарадскі і сельскі побыт"**.
■ Выстава **"Жыве мая ліра нанова!"**

ДОМ-МУЗЕЙ АДАМА МІЦКЕВІЧА Ў НАВАГРУДКУ
г. Навагрудак, вул. Леніна,1.
Тэл.: (8-01597) 2 43 40 (каса).
■ Пастаянная экспазіцыя: **"Жыццё і творчасць Адама Міцкевіча"**.
■ Пастаянныя выставы: **"Святло кухні Міцкевічаў"**, **"Малюнкі сельскага жыцця"**, **"Пан Тадэвуш" праз час і народы"**.
■ Выстаўка **Кастуся Качана "Мая Навагрудчына"**— да 31 жніўня.

ГАЛЕРЭІ

ПАЛАЦ МАСТАЦТВА
г. Мінск, вул. Казлова, 3.
Тэл./факс: 290 60 10.
■ Юбілейная выстава Веранікі Віткоўскай.

У МІНСКУ ГАЗЕТУ "КУЛЬТУРА" МОЖНА НАБЫЦЬ У НАСТУПНЫХ КРОПКАХ:

магазіны "Белсаюздрук"	кіёскі "Белсаюздрук"
Падземны пераход ст.м. "Пятроўшчына".	ст.м. "Няміга", вул. М. Багдановіча.
Падземны пераход ст.м. "Плошча Перамогі".	Праспект Пераможцаў, 5.
Праспект Незалежнасці, 44.	Вуліца Рабкораўская, 17.
Вуліца Валадарскага, 16.	Праспект Незалежнасці, 68, В.
	Вуліца Лабанка, 2.

ПА ПЫТАННЯХ РАЗМЯШЧЭННЯ РЭКЛАМЫ Ў ГАЗЕЦЕ "КУЛЬТУРА"
звяртайцеся па тэлефоне
+ 375 17 286 07 97
і па тэлефоне/факсе
+375 17 334 57 41
альбо пішыце на электронны адрас
kultura@tut.by!